ТРЫ ДНІ НАПЯРЭДАДНІ СЬВЯТА

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 301 (4207)
Серада, 4 лістапада 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

ПАВІННЫ СТАЦЬ ДНЯМІ БАЯВОГА ШТУРМУ ПРАРЫВАЎ У АДГРУЗЦЫ БУЛЬБЫ

РАЗЬБІЦЬ ДА КАНЦА АПАРТУНІСТЫЧНЫЯ СПРОБЫ ПРОЦІПАСТАВІЦЬ РВАЦКІЯ СПАЖЫВЕЦКА-МЕСЬНІЦКІЯ ІНТАРЭСЫ АГУЛЬНЫМ ІНТАРЭСАМ ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Да 7 лістапада поўнасьцю ліквідаваць запазычанасьць перад пралетамраі Ленінграду—адгрузіць 51.000 тон бульбы

На бальшавіцкую барацьбу за лён

Пераапрацоўка і загатоўкі прадукцыі тэхкультур уступілі ў рашаючы пэрыяд. Нашы перамогі ў вырашэньні праблемы тэхкультур, атрыманьня на этапах веснавой пасэўнай і асеньняй уборачнай, павінны быць замацаваны пасьпяховым сканчэньнем апрацоўкі ўсёй прадукцыі ільну і канапель і поўным выкананьнем ПЛЯНАЎ ЗАГАТОВАК У НАЙКАРАЦЕЙШЫ ТЭРМІН.

Ад таго, з якім посьпехам мы правядзем гэту кампанію, будзе залежаць далейшае АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАЕ ЎМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ, далейшы бурны рост сацыялістычнай ільна-канапляводчай гаспадаркі.

Клясавы вораг—кулак добра разумее, што нашы гаспадарчыя дасягненьні забясьпечваюць далейшы рост калгасаў і саўгасаў, набліжаюць завяршэньне суцэльнай калектывізацыі і разам з гэтым ліквідацыю кулацтва як клясы. Вось таму ён (кулак) скрыта і яўна вядзе шалёную барацьбу супроць бальшавіцкіх тэмпаў пераапрацоўкі ільну, стараецца затармазіць, сарваць загатоўкі.

Праяўленьні кулацкага ўплыву, напрыклад ужо ўскрыты ў калгасах «КАМУНАР», Брагінскага раёну, і «КАПЭРАТАР», Хойніцкага раёну, дзе першыя партыі ільнавалакна пачалі дзяліць паміж калгасьнікамі па кулацкім прынцыпе: «Хто вясной здаў насеньня, той больш і атрымлівае валакна».

Усякія рвацка-кулацкія тэндэнцыі дзяльбы ільну павінны зьнішчацца ў корані. ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ ЗАГАТОВАК ПРАДУКЦЫІ ТЭХКУЛЬТУР — ПЕРШАЧАРГОВАЯ ЗАДАЧА КАЛГАСАЎ, САЎГАСАЎ, МТС, БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ — АДНААСОБНІКАЎ.

Цьвёрды націск на кулацка-заможныя гаспадаркі, шырокае разгортваньне масавай растлумачальнай работы ва ко л загатовак, сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў—ВАЖНЕЙШЫЯ ЎМОВЫ ПАСЬПЯХОВАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ПЕРААПРАЦОЎКІ ЗАГАТОВАК ТЭХКУЛЬТУР.

Між тым, шматлікія паведамленьні з раёнаў гаворыць, што масавая растлумачальная работа пастаўлена надзвычай дрэнна.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб ходзе першапачатковай апрацоўкі і здачы прадукцыі ільну і канапель адзначае, што «РАЁННЫЯ ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, АСАБЛІВА ІЛЬНАВОДЧЫХ РАЁНАЎ, ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЕ ПЕРАБУДАВАЛІ СВАЁЙ РАБОТЫ І НЕ МАБІЛІЗАВАЛІ РАБОТНІКАЎ МТС, КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНЫЯ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІЯ ГАСПАДАРКІ НА ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ ПЕРШАПАЧАТКОВАЙ АПРАЦОЎКІ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ У ВЫЗНАЧАНЫ ТЭРМІН, ЧЫМ СТАВІЦЦА ПАД НЕПАСРЭДНУЮ ПАГРОЗУ СВАЯЧАСОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ЗАГАТОВАК».

У выніку ігнараваньня масавай работы і папітычнай недаацэнкі загатовак тэхкультур, мы маем ганебнае становішча: НА 25 КАСТРЫЧНІКА ЗАГАТОЎЛЕНА ТОЛЬКІ 1,5 ПРОЦ. ІЛЬНАВАЛАКНА І 30,6 ПРОЦ. ІЛЬНЯНОГА СЕМЯ.

РАШУЧЫ ПЕРАЛОМ ПАВІНЕН БЫЦЬ ЗАБЯСЬПЕЧАН НЕАДКЛАДНА. Штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва патрэбна перанесьці ў калгасы, саўгасы, вёску, на ільнаапрацоўчыя і загатоўчыя пункты. Тут кулак будзе весьці найбольш рашучую барацьбу за зрыў ільнаапрацоўкі і загатовак. Тут ён павінен атрымаць рашучы руйнуючы адпор.

Кожны калгас павінен мець выразны календарны плян работы па СУШЦЫ, МЯЦЬЦІ І ТРАПАНЬНІ, дэтальна аб гаворакы на агульна-калгасных сходах. Канвэер пераапрацоўкі і неадкладнай здачы прадукцыі дзяржаве павінен стаць СЫСТЭМАЙ РАБОТЫ. Барацьба за ЯКАСЬЦЬ прадукцыі зьяўляецца СУСТАЎНОЙ І ВАЖНЕЙШАЙ ЧАСТКАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ТЭХКУЛЬТУРЫ.

Увядзеньне зьдзельна-прэміяльнай сыстэмы, разгортваньне сацпаборніцтва і ўдарніцтва—забясьпечыць бесьперапынную нагрузку сушань і мялак на працягу ня менш дзьвёхзьменнай работы ў суткі. Складаныя і простыя мялні павінны працаваць бесьперабойна.

Памятаючы, што асноўная маса прадукцыі тэхкультур у гэтым годзе будзе яшчэ пераапрацавана на простых мялках з коннымі прыводамі і ўручную, неабходна ўсямерна фарсаваць будаўніцтва ільназаводаў. Заводы ў гэтым годзе пераапрацуюць каля 20 проц. трасты. Загатоўка трасты ў вызначанай па плянах колькасьці павінна быць скончана ў бліжэйшы час, прычым заводы павінны атрымаць трасту толькі ВЫСОКАЯ ЯКАСЬЦІ, згодна ўстаноўленых стандартаў.

ЗАГАТОЎЧЫ АПАРАТ УСЁ ЯШЧЭ НЕ ПЕРАБУДАВАЎ СВАЁЙ РАБОТЫ. Рад райкаапільнасаюзаў не ўзначаліў барацьбы за масавае разгортваньне загатовак. Сыстэма БЕЛКААПСАЮЗУ зьяўляецца ў гэтым годзе асноўным загатоўшчыкам у 54 раёнах. Гэта абавязвае аддаць максымум увагі перабудове ўсёй работы. Толькі няўменьнем перабудаваць сваю работу і можна вытлумачыць такое ганебнае становішча, што СЫСТЭМА БЕЛКААПСАЮЗУ ЗЛАЧЫННА АДСТАЕ Ў ЗАГАТОЎКАХ. (На 25 кастрычніка гадавы плян загатовак выкананы НА 0,8 ПРОЦ. па валакне).

Рушыць загатоўчы апарат у масы, НА БАРАЦЬБУ ЗА ЛЁН, ЗА ЯКАСЬЦЬ ВАЛАКНА—ТАКАЯ ЗАДАЧА. Больш таго, факты з месц гавораць, што сярод загатоўшчыкаў ёсьць значны процэнт былых гандляроў, пазбаўленых выбарчых правоў. Чыстка загатоўчага апарату ад клясава-варожых элемэнтаў—неадкладная задача.

Выразная дырэктыва партыі аб увядзеньні сыстэмы аплаты загатоўшчыкаў у залежнасьці ад колькасьці і якасьці загатоўленай прадукцыі ажыцьцяўляецца надзвычай марудна.

Разам з гэтым мы маем ганебныя прыклады разбазарваньня прамтавараў, прызначаных для стымуляваньня загатовак тэхкультур. Гэтаму павінен быць ПАЛОЖАН РАШУЧЫ КАНЕЦ.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове адзначае, што «АПРАЦОЎКА ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ І СВАЯЧАСОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ ЗАГАТОВАК ТЭХКУЛЬТУР ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ПОБАЧ З ВЫВАЗАМ БУЛЬБЫ, МЯСА І ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК НА бліжэйшы час важнейшай гаспадарча-палітычнай задачай на вёсцы».

Для правядзеньня гэтай важнейшай работы сапраўды па-ўдарнаму ЦК КП(б)Б АББЯСЬЦІЎ МЕСЯЧНІК З 10 ЛІСТАПАДА ДА 10 СЬНЕЖНЯ. За гэты час павінна паступіць ня менш 70 ПРОЦ. ІЛЬНАПЯНЬКАВАЛАКНА. Загатоўкі ільнянога семя павінны СКОНЧЫЦЦА Ў ЛІСТАПАДЗЕ.

Усе цэнтральныя загатоўчыя і раённыя партыйныя, камсамольскія, савецкія і прафсаюзныя арганізацыі павінны зараз-жа мабілізавацца на выкананьне задач, пастаўленых перад імі Цэнтральным Камітэтам партыі. Неадкладна ліквідаваць усе недахопы, якія выявіліся ў пачатку кампаніі, перабудаваць усю работу ў адпаведнасьці з шасьцю ўказаньнямі тав. Сталіна.

МЫ МОЖАМ І ПАВІННЫ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯНЫ ПЕРААПРАЦОЎКІ І ЗАГАТОВАК ТЭХКУЛЬТУР У ТЫЯ ТЭРМІНЫ, ВЫЗНАЧАНЫЯ ПАРТЫЯЙ.

Раўняючыся па ПЕРАДАВЫХ калгасах, якія ўжо выканалі свае пляны загатовак, арганізоўваючы ўзаемадапамогу паміж калгасамі і аднаасобнікамі, у усе калгасы, саўгасы і аднаасобныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі павінны выканаць свой абавязак перад дзяржавай і ў найкарацейшы тэрмін здаць усе ішкі прадукцыі тэхкультур паводле самаабавязацельстваў і плянаў.

РАЗВАЖАНЬНІ ПРАВЫХ І «ЛЕВЫХ» АПАРТУНІСТАЎ АБ НЕРЗАЛЬНАСЬЦІ ПЛЯНАЎ, АБ ЧАРГОВАСЬЦІ КАМПАНІЙ ПАВІННЫ АТРЫМАЦЬ САМЫ ЖОРСТКІ АДПОР. Кулацка-рвацкія тэндэнцыі захаваць лён і пянку, ня здаць дзяржаве трэба бязьлітасна разьбіваць да канца.

САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ ЧАКАЕ СЫРЦУ. МЫ МОЖАМ І ДАМО ЯГО СВАЯЧАСОВА.

Ход адгрузкі бульбы Ленінграду

(У ТОНАХ)

30/X—	31/X—	1/XI—	2/XI—	УСЯГО
3468	3019	1964	3647	123.836
				70,6 %

Праз 3 дні наступае апошні тэрмін, устаноўлены партыяй і ўрадам для поўнага выкананьня пляну вывазу бульбы рабочым Масквы і Ленінграду. Аднак, ня гледзячы на вельмі кароткі тэрмін, доўг пралетарскім цэнтрам за БССР застаўся вялізны: вывезена на 2 лістапада толькі 127.570 тон замест 188.000 тон ці 67,8 проц. пляну. Такім чынам за гэтыя тры дні засталося адгрузіць 60.000 тысяч тон бульбы. Між тым, даныя аб ходзе адгрузкі за апошнія дні паказваюць вельмі вялікае зьніжэньне тэмпаў. Даволі сказаць, што за апошнія 4-5 дзён адгрузка не перавышала 3.500 тон.

Асноўнае зло заключаецца ў тым, што да гэтага часу, ня гледзячы на рад рашучых і выразных дырэктыў ЦК КП(б)Б і СНК БССР, загатоўчыя арганізацыі не ўсьвядомілі важнасьці гэтага заданьня, не пранікліся жаданьнем дзейнічаць па-баявому, не перабудавалі сваёй работы на пачатках выразнага, канкрэтнага кіраўніцтва сваімі нізавымі зьвеньнямі.

Замест асабліва патрэбнага зараз пачуцьця адказнасьці за выкананьне пляну, замест жывой справы, як у цэнтры, так і на месцах, наглядаецца расхлябанасьць, бездапазнасьць, арыентыроўка на самацёк, няўменьне рушыць справу ўперад.

На нарадзе загатоўчых арганізацый, якая адбылася 2-га лістапада пры СНК БССР, з ўсёй выразнасьцю высьветліліся прычыны ганебнага зьніжэньня тэмпаў адгрузкі бульбы. Ва многіх раёнах загатоўчыя арганізацыі амаль зусім спынілі загатоўкі. Раённыя работнікі, якія былі накіраваны ў калгасы і вёскі для правядзеньня кампаніі па вывазцы бульбы, зьвярнуліся ў раён, адарваліся ад непасрэднага кіраўніцтва гэтай важнейшай работай. Гэта прыводзе да таго, што калгасы, якія ў асноўным вельмі слаба выконваюць пляны здачы ішкаў бульбы дзяржаве, прыступілі да разьмеркаваньня бульбы, для сваіх патрэб, сталі буртаваць бульбу, закінуўшы адказьнейшы вучастак работы—адгрузку пралетарскім цэнтрам (СТАРОБІН, УВАРАВІЧЫ, ЧАВУСЫ, ДУБРОЎНА, КЛІЧАЎ і інш.).

Зусім зразумела, што аслабленьнем увагі да загатовак і адгрузкі бульбы з боку загатоўчых арганізацый карыстаецца кулацтва і яго агентура, якія вядуць шалёную агітацыю супроць здачы бульбы дзяржаве і распальваюць, няжыты яшчэ сярод адсталых груп калгасьнікаў, дробна-ўласьніцкія спажывецкія тэндэнцыі. Толькі гэтым можна растлумачыць той факт, што замест арганізацыі канвэйрнай сыстэмы—бесьперабойнай вывазкі бульбы на чыгуначныя станцыі, многія калгасы буртуюць бульбу, зусім не клапоцячыся аб снабжэньні пралетарскіх цэнтраў.

Асабліва недапушчальным зьяўляецца тое, што значная частка раёнаў лічэць гэтыя факты зусім нармальнымі, забыўшы аб выразнай дырэктыве партыі: «ПЕРАКЛЮЧЫЦЬ УСЕ РАЁНЫ НА ВЫВАЗ БУЛЬБЫ ДЛЯ ЛЕНІНГРАДУ, СПЫНІЎШЫ ЎСЯКІЯ ПЕРАВОЗКІ БУЛЬБЫ ПА ЧЫГУНЦЫ ДЛЯ МЯСЦОВЫХ ПАТРЭБ». (З пастановы ЦК КП(б)Б).

Для максымальнага ўзмацненьня вывазкі па лініі чыгункі дана рашучая распараджэньне поўнасьцю забясьпечваць усе заяўкі загатоўцаў на вагоны. Аднак, вагоны, што падаюцца, злачынна не выкарыстоўваюцца. Так, за 2 лістапада па чыгунках БССР па віне загатоўцаў не скарыстаны 123 вагоны. Надзвычай патрэбны паражняк з-за бязьдзейнасьці загатоўцаў прастаяў пішнія суткі.

Гэтыя моманты неабходна расцэньваць, як простае шкодніцтва і падрыў работы транспарту. Загатоўчыя арганізацыі, якія запатрабавалі вагоны і не пагрузілі іх, павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

Ня гледзячы на дырэктывы аб кругласутачнай прыёмцы і адгрузцы бульбы, у раёнах нагнадаюцца абурэчыя факты празмернага затрыманьня сялян, непрыстасаванасьці прыёмачных пунктаў для работы ў начны час (няма ліхтароў і г. д.). Многія пункты па-казённаму канчаюць работу ва ўстаноўленыя гадзіны, ня пічаўся з неабходнасьцю грузіць падвезеную бульбу.

Усё гэта, а таксама вельмі дрэнная пастаноўка ўліку па загатоўцы і адгрузцы бульбы, вымушаюць прыняць выключныя меры да паляпшэньня загатоўчай работы, прымушаюць з усёй рашучасьцю папярэдзіць загатоўчыя арганізацыі як цэнтральныя, так і раённыя, а таксама райкомы і выканкомы аб тэй адказнасьці, якая на іх ускладаецца за дапушчэньне зрыву загатовак і вывазкі.

ПАРТЫЯ ПАТРАБУЕ АД УСІХ АРГАНІЗАЦЫЙ, АД УСІХ РАЁНАЎ РАШУЧЫХ МЕР ДА НЕАДКЛАДНАЙ ПЕРАБУДОВЫ ЗАГАТОЎЧАЙ РАБОТЫ, У БОК НАБЛІЖЭНЬНЯ ЯЕ ДА СЯЛА І КАЛГАСУ. Партыя патрабуе ад Белкалгасцэнтру неадкладнай мабілізацыі свайго апарату і ўсіх калгасаў на здачу дзяржаве ішкаў бульбы і прыняцьця мер, якія б гарантавалі выкананьне дырэктыў аб барацьбе са спажывецкімі настроямі, што ўзьнікаюць на глебе агітацыі кулацкіх элемэнтаў.

Усе раёны павінны скончыць вывазку бульбы не пазьней 5 лістапада, кінуць у сяло, калгас максымальную колькасьць сіл для непасрэднай работы па арганізацыі вывазкі бульбы да станцый.

УПАЎНАВАЖАНЫЯ ЦК І СНК ПАВІННЫ ЗАСТАВАЦЦА Ў РАЁНАХ ДА ТАГО ЧАСУ, ПАКУЛЬ АПОШНІ ГЭКТАР БУЛЬБЫ НЯ БУДЗЕ ВЫКАПАН, ПАКУЛЬ НЕ АДЫЙДЗЕ АПОШНІ ВАГОН ДЛЯ ПРАЛЕТАРСКІХ ЦЭНТРАЎ.

Арганізацыяй чырвоных абозаў і зьлёнаў, у адзнаку 14-ай гадавіны Кастрычніка, бальшавіцкім разгортваньнем сацпаборніцтва і ўдарніцтва зламаем кулацка-месьніцкія настроі, даб'ёмся ўдзесяцярэньня тэмпаў і забясьпечым выкананьне заданьня партыі і ўраду.

Забясьпечыць бесьперабойны прыём чырвоных абозаў у дні сьвята

ЗАГАД

ПА НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯЦЕ СНАБЖЭНЬНЯ БССР

3 лістапада 1931 г. г. Менск. № 316.

УЛІЧВАЮЧЫ, ШТО Ў РАДЗЕ РАЁНАЎ БССР У ДНІ КАСТРЫЧНІКАГА СЬВЯТА Ў АДЗНАКУ XIV-АЙ ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА АРГАНІЗУЮЦЦА МАСАВЫЯ ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ ІЛЬНУ І ЗБОЖЖА, ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ І ЭШАЛЁНЫ БУЛЬБЫ ДЛЯ АДГРУЗКІ МАСКВЕ І ЛЕНІНГРАДУ І ШТО Ў СУВЯЗІ З ГЭТЫМ ЗАГАТОЎЧЫЯ, ПРЫЁМАЧНЫЯ І РЭГУЛЮЮЧЫЯ ОРГАНЫ ПАВІННЫ ПРАВОДЗІЦЬ НАРМАЛЬНУЮ РАБОТУ, — ЗАГАЛДВАЮ:

1. ДНІ СЬВЯТА XIV-АЙ ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА — 7 І 8 ЛІСТАПАДА АБВЯСЬЦІЦЬ ПРАЦОЎНЫМІ ДНЯМІ ДЛЯ ЎСІХ РАЁННЫХ ЗАГАТОЎЧЫХ, ПРЫЁМАЧНЫХ АПАРАТАЎ І РАЙСНАБАЎ, А ТАКСАМА ДЛЯ ЎСІХ ЦЭНТРАЛЬНЫХ ЗАГАТОЎЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ: БЕЛПЛАДАГАРОДНІНЫ, БЕЛКААПЛАДАГАРОДНІНЫ, БЕЛСАДСАЮЗУ, БЕЛЛЬНАСАЮЗУ, БЕЛХЛЕБЖЫЎСАЮЗУ, БЕЛАРУСКАЙ КАНТОРЫ САЮЗХЛЕБУ І НАРКАМСНАБУ БССР.

Народны Камісар Снабжэньня БССР
БАЛЦІН.

Злачынная бязьдзейнасьць

З 4.973 тон бульбы, якія Вушацкі раён павінен адгрузіць Ленінграду, адгружана толькі 457 тон.

Сарачынскі, Чарапаўшчанскі, Усайскі і Глыбачанскі сельсаветы ў выніку злачыннай бязьдзейнасьці не адгрузілі ніводнага цэнтнэра бульбы. Упарадзе па адгрузцы ідуць наступныя сельсаветы: М.-Далецкі, Масырскі і Плінскі, якія выканалі плян на 60 проц. У бліжэйшыя дні плян імі будзе выканан поўнасьцю.

Прыклад трох лепшых сельсаветаў гаворыць за тое, што плян адгрузкі можа і павінен быць выканан поўнасьцю і своячасова.

Тэлеграма

Усім старшыням калгассаюзаў і ўпаўнаважаным Белкалгасцэнтру

Здача бульбы калгасамі праходзіць зусім дрэнна. На радзе раёнаў ёсьць факты злоснага разбазарваньня бульбы, утойваньне ад здачы шляхам складаньня дутых кармовых балянсаў, гэтым самым—ухіленьне ад выкананьня калгасамі сваіх абавязкаў перад дзяржавай.

На падставе поўнага і першачарговага выкананьня пляну загатовак бульбы, з усямернага ўзмацненьня клясавай пільнасьці, разгарнеце масавую работу, пастаўце работу па бульбазагатоўках на ўзроўні, аналёгічным збожжазагатоўкам. Праверце здачу бульбы калгасамі, высьветліце некалькі канкрэтных прыкладаў разбазарваньня і утойваньня бульбы і неадкладна перадавайце ў суд вінаватых у разбазарваньні, з апублікаваньнем у друку. Просім рэдакцыі раённых газэт прасачыць за выкананьнем гэтай дырэктывы.

Калгасцэнтр СТРЭЛЕ.

Толькі 30 проц.

СТАРОБІН. Адгрузка бульбы Ленінграду на Старобінскім раёне праходзіць злачынна марудным тэмпамі. Да гэтага часу адгружана толькі 30 проц.

Моцна адстаюць калгасы — выканалі толькі 15 проц. пляну. Гэта тлумачыцца тым, што праўленьні некаторых калгасаў («Чырвоны хлебароб» і «Камунар») імкнуцца перш-наперш забясьпечыць сябе. Гэтыя калгасы ніводнага цэнтнэра бульбы не здалі дзяржаве.

Зрыве адгрузку бульбы старшыня калгасу «Савецкая Морач» — Махнавец Алесь. Ён разьмяркоўваў бульбу па кулацкім прынцыпе па 3-0 пудоў на гаспадарку. Між тым, з плянавага заданьня 610 пудоў здана толькі 100 пудоў бульбы.

Раённыя загатоўчыя арганізацыі, замест баявой работы на выкананьні пляну, займаюцца размовамі аб тым, дзе іншы арганізацыі загатаўляць. Зусім недапушчальна пастаўлен улік паступаючай бульбы ў райкаапсаюзе. Гэта не дае магчымасьці апэрацыйна кіраваць загатоўкамі.

Патрэбен неадкладны зрух. Трэба даць рашучы адпор кулацкім спажывецкім тэндэнцыям. Загатоўчыя арганізацыі павінны спынціць размовы і ўзяцца за работу па-баявому.

Пастанова Пленуму ЦК УсеКП(б)—на абгаварэньне кожнай брыгады

ВУГАЛЬНЫЯ СКЛАДЫ—

у баявую гатоўнасьць

У Гомелі паравозы прастойваюць на вугальных складах дзесятні гадзін

Перавесьці грузчыкаў на зьдзельшчыну, ліквідаваць ураўнілаўку і абязьлічку

Пленум ЦК УсеКП(б), які адбыўся 28-31 кастрычніка 1931 году, у сваёй рэзалюцыі аб чыгуначным транспарце вызначыў цэлы рад канкрэтных задач, якія павінны поўнасьцю забясьпечыць пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне плянаў асеньня-зімовых перавозак трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Адной з такіх умоў, якая павінна ў значнай ступені забясьпечыць выкананьне плянаў асеньня-зімовых перавозак, зьяўляецца павялічэньне карыснай работы паравозаў ня менш, як на адну гадзіну.

Баявое выкананьне гэтага мерапрыемства партыі і ўраду дасьць магчымасьць чыгунцы замяніць работу дадатковых 1.400 паравозаў.

У выкананьне гэтай баявой задачы адказьнейшую ролю будуць адыгрываць рабочыя і гаспадарнікі вугальных складаў, кантрольных пастоў і і. д. Між тым, трэба адзначыць, што кіраўнікі вугальных складаў і кантрольных пастоў да гэтага часу не перабудавалі сваёй работы па-новаму з тым, каб без затрыманьня нагружаць паравозы вугалем, прапускаць своячасова праз кантрольныя пасты і г. д.

Паравозы, як правіла, на вугальных складах і кантрольных пастох прастойваюць непрадукцыйна цэлымі гадзінамі. Рабочыя вугальных складаў і кантрольных пастоў у Гомелі, Жлобіне і Віцебску і іншых пунктах працуюць чарапашымі тэмпамі.

Асноўная прычына дрэннай работы вугальных складаў—няправільная расстаноўка рабочай сілы і адсутнасьць стымулу для ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы. Рабочыя-грузчыкі вугалю на гомельскім і іншых складах працуюць падзённа і не зацікаўлены сваёй работай. Зьдзельшчына адсутнічае. Пры падзённай рабоце грузчык вугалю зарабляе ня больш, як 60-70 руб. у месяц, а грузчыкі, якія працуюць на зьдзельшчыне, заробляюць ад 150 да 200 рублёў у месяц.

Грузчыкі вугальных складаў ужо доўгі час дабіваюцца, каб іх пераявілі на зьдзельшчыну, але раённыя арганізацыі не рэалізуюць гэтай прапановы.

Безадкладны перавод рабочых вугальных складаў на зьдзельшчыну, павялічыць зацікаўленасьць рабочых, зьвяліцца магутным сродкам у барацьбе за ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы, а разам з гэтым значна скароціцца прастоі паравозаў пад нагрузкай вугалю і пад экіпіроўкай.

На вугальных складах Віцебскага і іншых вузлоў падёмныя краны і маторы абязьлічаны. Двары складаў завалены рознымі грузамі. Паравозы падаюцца і адпраўляюцца са складаў несваячасова, кантроль за работай дзённых і начных зьмен адсутнічае.

Сёньня мы зьмяшчаем матар'ял, які характарызуе работу гомельскага вугальнага складу і сьведчыць аб тым, што ў пытаньні работы вугальных складаў і кантрольных пастоў існуе поўны самацёк.

Апартуністычнай стаўцы на самацёк у рабоце вугальных складаў трэба даць рашучы адпор.

Кожнаму работніку чыгуначнага транспарту, дзе-б ён не працаваў, трэба добра памятаць, што напружаны плян асеньня-зімовых перавозак патрабуе выразнай, хуткай і самаддапай работы.

Паравоз можа і павінен працаваць ня менш, як 10,7 гадз. у суткі. Для гэтага трэба выкарыстаць усе ўнутраныя рэсурсы, мабілізаваць актыўнасьць рабочых-чыгуначнікаў і безадкладна ўбраць усе бар'еры, якія перашкаджаюць пасьпяховай рабоце паравознага парку.

Вугальныя склады і кантрольныя пасты чыгуначнага транспарту БССР павінны быць безадкладна прыведзены ў баявую гатоўнасьць.

Толькі на вугальным складзе паравозы трацяць па лішняй гадзіне

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Тав. Андрэеў у сваім загадзе аб асеньня-зімовых перавозках, побач з іншымі важнейшымі задачамі, ставіць выразна пытаньне аб павялічэньні карыснай работы паравозаў і вагонаў на адну гадзіну ў суткі. Ва ўмовах Гомельскага вузла гэта мерапрыемства настолькі рэальнае, што толькі адным упарадкаваньнем работы на вугальным складзе можна дабіцца нават больш гадзіны памяншэньня прастою паравозаў. На ўсю экіпіровачную работу, як набор апалу, чыстка катла і набор вады, патрабуецца максымальна дзьве гадзіны. Пагрузка тоны вугалю пры наяўным у Гомелі падёмным абсталяваньні павінна цягнуцца ня больш 6 хвілін. Калі лічыць, што ў сярэднім паравоз бярэ 10 тон вугалю, гэта значыць для пагрузкі патрэбна адна гадзіна плюс 40 хвілін для чысткі катла і 10 хвілін для набору вады. Але ў сапраўднасьці паравозы прастойваюць на вугальным складзе ад 3 да 5 з палавою гадзін.

Паводле зводкі ад 15 кастрычніка, паравоз Щ-4548 прыбыў са Жлобіна і адправіўся на склад у 21 гадз., а выехаў са складу ў 24 гадзіны. Паравоз № 6003 прыбыў на склад у 3 гадзіны, а паехаў са складу ў 7 гадзін. Цягнікі стаяць лішнюю гадзіну або дзьве на складзе толькі таму, што рабочыя-грузчыкі вугалю працуюць падзённа і не зацікаўлены сваёй работай. Яны гавораць: «Чаму грузчык на таварнай станцыі працуе зьдзельна, заробляе ад 150 да 200 руб., а мы працуем падзённа і заробляем 60-70 руб. у месяц».

Грузчыкі вугалю ўжо больш году ўздымаюць пытаньне аб пераводзе іх на зьдзельную аплату. Але ні вучпрафсаюз, ні праўленьне раёну ня выканалі гэтай прапановы. У выніку цягнікі на складзе стаяць у чарзе, вугаль на месцы ня пыхтуецца, а машыністу прыходзіцца ехаць з вугалем розных марак.

Б. Зэльманаў.

Менгарком КП(б)Б склікае сёньня, 4-га лістапада, у 6 гадз. вечара, у памяшканьні кіно тэатру „КУЛЬТУРА"

агульна-гарадзкі сход партыйнага актыву.

Парадок дня:

ДАКЛАД ТАВ. ГЕЯ АБ ВЫНІКАХ АПОШНЯГА ПЛЕНУМУ ЦК УсеКП(б).

Члены ЦК, ЦКК, ГК, Гар. КК праходзяць па сваіх мандатах. Сакратаром ячэек прапануецца зьявіцца ў Гарком з 9-ці да 4-х гадз. дня ў пакой № 10 за білетамі.

Менгарком КП(б)Б.

Аб ходзе першапачатковай апрацоўкі і здачы прадукцыі ільну і канапель

Пастанова ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б прызнае, што:

1) Ход першапачатковай апрацоўкі ільну і канапель ва ўсіх раёнах праходзіць зусім нездавальняюча, у выніку чаго загатоўкі ільну і канапель (валакна) амаль не распачаты і выкананы на 25-га кастрычніка толькі на 1,5 проц., прычым сырэц здаецца заводам нізкай якасьці.

У такім-жа нездавальняючым становішчы знаходзіцца загатоўка ільнасемя і канапель (на 25-X—30,6 проц. гадавога пляну).

ЦК прапануе ўсім партыйным арганізацыям пры правядзеньні ільназагатовак улічыць вопыт загатоўчай кампаніі бягучага году і зьвярнуць асаблівую ўвагу на своячасовае і поўнае выкананьне абавязацельстваў з боку калгасаў і саўгасаў.

Раённыя партыйныя арганізацыі, асабліва ільнаводчых раёнаў, да гэтага часу не перабудавалі сваёй работы і не мабілізавалі работнікаў МТС, калгасьнікаў і аднаасобных бядняцка-сераднякіх гаспадарак на выкананьне пляну першапачатковай апрацоўкі ільну і канапель у вызначаны тэрмін, чым ставіцца над непасрэдную пагрозу своячасовае выкананьне пляну загатовак. У большасьці калгасаў не распрацаваны канкрэтныя каляндарныя пляны незаводзкай апрацоўкі ільну і канапель і здачы дзяржаве таварнай прадукцыі, ня ўведзена зьдзельшчына, зусім слаба разгорнута сацпаборніцтва і ўдарніцтва, работа па апрацоўцы ільну і канапель ня ўвязваецца з асноўнымі мерапрыемствамі па арганізацыйна-гаспадарчым узмацненьні калгасаў; ёсьць выпадкі разьмеркаваньня валакна паміж калгасьнікамі да здачы (продажу) таварнай прадукцыі дзяржаве (Хойнікі, Брагіна).

Да гэтага-ж часу не заключаны сацдагавары паміж прамысловымі прадпрыемствамі, якія перапрацоўваюць лён, з ільнаводчымі раёнамі і асобнымі калгасамі аб хутчэйшай пераапрацоўцы ільну і канапель і здачы (продажу) іх у адпаведнасьці з кантрактацыйнымі дагаварамі.

2) Ня гледзячы на неаднаразовыя пастановы ЦК КП(б)Б і СНК аб тэмпах будаўніцтва ільназаводаў, да гэтага часу ня скончана будаўніцтва нават заводаў першай чаргі. Прычынамі такога маруднага будаўніцтва ЦК лічыць:

а) нераспарадчасьць Белільнаканапляводбуду,

б) невыстарчальную ўвагу з боку адпаведных РК і РВК і

в) бюракратычныя адносіны снабжаючых арганізацый (Белдзяржснаб) да своячасовага забесьпячэньня будаўнічымі матар'яламі.

3) Значная частка прамтавараў, вызначаных для стымуляваньня ільназагатовак, фактычна на месцы не завезена. Ёсьць шматлікія выпадкі абязьлічваньня гэтых тавараў і расходваньня іх на іншыя мэты.

Выходзячы з такога становішча, ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Зьвярнуць увагу РК, РВК, зямельных, калгасных і загатоўчых арганізацый, саўгасаў і МТС на тое, што апрацоўка ільну і канапель і своячасовае выкананьне пляну загатовак тэхкультур зьяўляецца побач з вывазкай бульбы, мяса і збожжазагатоўкамі на бліжэйшы час важнейшай гаспадарча-палітычнай задачай на сяле.

У адпаведнасьці з гэтым павінен быць неадкладна мабілізован на выкананьне паказаных задач увесь раённы партыйны і савецкі актыў. Асабліва ў сувязі з кампаніяй перавыбараў парторганаў ячэйкі КП(б)Б павінны мабілізаваць увагу ўсіх камуністаў, рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў на выкананьні гэтай вышэйшай задачы, узмацніўшы штодзённае кіраўніцтва работай па апрацоўцы і загатоўцы ільнавалакна і пянькі.

Павінна быць абвешчана самая рашучая барацьба апартуністычнай недаацэнцы значэньня ільназагатовак і своячасовай апрацоўкі ільну, рвацтву, захоўваньню ільну ад дзяржавы і кулацкай агітацыі, накіраванай на зрыў ільназагатовак.

Ні ў якім разе не павінна быць дапушчана памылка мінулага году, якая выявілася ў недаацэнцы значэньня ільназагатовак і прывяла, у выніку крайняй зацяжкі ільназагатоўчай кампаніі, да значнага недавыкананьня пляну загатовак.

2. З прычыны паступленьня рашаючага пэрыяду апрацоўкі ільну і канапель, выкананьня загатоўчых пляну і здачы дзяржаве, ЦК КП(б)Б пастанаўляе абвясьціць месячнік з 10-XI па 10-XII г. г. На працягу месячніка павінна быць апрацавана і здана (прадана) дзяржаве ўся вызначаная да здачы, згодна

...ктыўны ліст ЦК КП(б)Б аб перавыбарах парторганаў ДАВЕСЬЦІ ДА КОЖНАГА КАМУНІСТА

...ПАЧАТКУ ПЕРАВЫБАРАЎ ЗАСТАЛАСЯ ТОЛЬКІ ДЭКАДА. СКАРЫСТАЦЬ ЯЕ ДЛЯ ШЫРОКАЙ САМАПРАВЕРАЧНАЙ РАБОТЫ

...ньнем за поўнае ажыццяўленьне 6 сталінскіх умоў пранізаць усю справаздачна-перавыбарчую кампанію

...шавіцкая праграма работы партыйных арганізацый у новых умовах

...ада апублікаваў дырэктыў КП(б)Б аб перавыбарах ...У гэтым лісце даецца ...тычны аналіз сучаснага ...лістычнага будаўніцтва, ...ісьлены ўсе вузлавыя за... партыі і выраша... ...ляхі і мэтады далейшай ...барацьбы за новыя пера... ...франтох разгорнутага са... ...ка наступленьня.

...ст сацыялістычнай інду... ...ротная перавага сацыялі... ...ктару ў сельскай гаспадар... ...ньне партыйнага ўплыву ...ластках работы—вось у ас... ...ах паказальнік бальшаві... ...КП(б)Б у бязьлітаснай ба... ...ва фронты, па ачўхільнае ...ньне генэральнай лініі пар... ...перамогамі і грандыёзнымі ...лейшай барацьбы за чаль... ...эмны сацыялістычнага бу... ...а ажыццяўленьне ленін... ...у—у бліжэйшы перыяд да... ...трэдніць у тэхніка-эканаміч... ...ных перадавых капіталістыч... ..., новай даволі складанай ...і ўмовамі вызначаецца ўся ...важнасьць справаздачна-пе... ...кампаніі парторганаў. Но... ...і задачы патрабуюць ад ...тарганізацыі, кожнай пер... ...йкі сканцэнтраваць увагу ...х пытаньнях сацыялістыч... ...ўніцтва, на неабходнасьці ...ізацыі ў рабоце 6-ці сталін...

...ны работу прамысловасьці ...аў бягучага году, характа... ...рычны адставаньня раду ...каньні вытворчай праграм... ...(б)Б падкрэсьлівае: «наша ...эальна, няма і ня можа ...ь аб'ектыўных прычын для ...я прарываў. Посьпехі перад... ...даў і фабрык, якія датэрмі... ...ілі свае пяцігодкі—яркі ...пютнай рэальнасьці пляну».

...а недавыкананьня прамфін... ...ам прадпрыемстваў БССР за... ...ў тым, што многія пар... ...графаскыя арганізацыі і ...кі не пераключыліся яшчэ ...ць на новыя мэтады работы, ...даваці сваёй работы ў адпа... ...з новай абстаноўкай і зада... ...ка на ўсюды яшчэ правіль... ...ены партыйныя сілы, не ...а яшчэ ўмацаваньне лен... ...ўністычнымі сіламі і перада... ...нікамі з беспартыйных тава... ...рных органаў вядучых цэ... ...прадпрыемствах. Не забіта ...ткова абязьлічка і безадказ... ...рабоце, ня выкаранена ўраў... ...зарплаце. Усё яшчэ невы... ...вяецца барацьба за ўка... ...ва ўсе вытворчыя зьвяны ...ка разрахунку і барацьба з ...ынымі скажэньнямі яго ...ў. Таму ў дырэктыўным ...перавыбарах гаворыцца: «Пе... ...я кампанія павінна прайсьці ...м кампаніі перабудовы ўсёй ...-масавай работы ў адпавед... ...новымі задачамі. Партаргані... ...ынны замацаваць першыя ...перабудовы партработы на ...ьці і ўзьняць гэту перабудо... ...ую вышэйшую ступень».

...барчая кампанія павінна за... ...ь поўнае завяршэньне пера... ...артыйна-масавай работы, па... ...е якасьці гэтай работы ў ні... ...ньнях, дзе рашаецца выка... ...рамфінпляну. Пры гэтых умо... ...ўмовах павялічэньня аван... ...олі камуністаў па выкананьні ...нскіх умоў забясьпечваецца ...арацьбы за выкананьне і пе... ...ньне прамфінпляну, за новыя ...і нормамі.

...значным тормазам у выка... ...одна-гаспадарчага пляну ...а яшчэ невыстарчальная ра... ...ата транспарту. Транспарт, як ...гэта апошнім пленумам ЦК ...«усё яшчэ застаецца вузкім ...адным з сур'ёзнейшых тор... ...справе пасьпяховага выканань-

ня народна-гаспадарчага плянаў».

ЦК КП(б)Б заклікае партарганізацыі і ў першую чаргу транспартныя заблісьпечыць цаляшпэньне партыйна-масавай работы па мабілізацыі рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу «на барацьбу за здаровы гаспадарчаразрахунковы паравоз, сапраўды ажыццяўляючы замацаваньне спаранай, за здаровы вагонны парк, за ліквідацыю абязьлічкі вагоннай гаспадаркі, за якасьць паравознага рэмонту і максымальнае выкарыстаньне паравозаў і вагонаў, за ліквідацыю абязьлічкі, непаваротлівасьці і інэртнасьці ў рабоце чыгуначнага і воднага транспарту». Іменна станоўчае вырашэньне гэтых пытаньняў, умацаваньне камуністычнымі кадрамі ўсіх зьвеньняў апарату чыгункі, правараньне дырэктыў партыі аб транспарце ў жыцьцё ўзьніме яго работу на вышыню, якая адпавядае сучасным этапам сацыялістычнага будаўніцтва.

Надыходзячая справаздачна-перавыбарчая кампанія парторганаў зьяўляецца «баявой падрыхтоўкай да 4-га завяршаючага году пяцігодкі, выкананьня і перавыкананьня плянаў апошняга кварталу рашаючага году пяцігодкі». Аднак з шасьці сталінскіх умоў, забясьпечваючых новыя вытворчыя перамогі, зьяўляецца задача паляшпэньня рабочага забясьпечэньня і культурна-бытавых умоў. Важнасьць гэтай задачы партыя высунула ў цэнтр увагі і ставіць яе побач з пытаньнямі індустрыялізацыі. Таму пытаньні перабудовы работы каапэрацыі, разгортваньня савецкага культурнага гандлю набываюць зараз актуальнейшае значэньне. Трэба рашуча ўзмацніць барацьбу як супроць «лева»-апартуністычных элементаў—староньнікаў непасрэднага пераходу да прадуктаабмену і простага разьмеркаваньня, так і супроць правых апартуністаў—носьбітаў «нэпманаўскага духу». Перавыбарчая кампанія павінна забясьпечыць каренны пералом у рабоце партарганізацыі па кіраўніцтве каапэрацыяй, панесьці руйнуючы ўдар на праяўленьнях буржуазных імкненьняў «гандлю для гандлю», нэпманаўскага гандляроства, захапленьня гандэцыямі камэрцыйнага гандлю. Бяз сур'ёзнай барацьбы са скажэньнямі лініі партыі ў рабоце каапэрацыйных і інш. органаў забясьпечэньня немыслімa заваяваньне зарастаючых патрэб рабочых і калгасных мас. Пытаньні рабочага забясьпечэньня, паляшпэньня абслугоўваньня рабочых і калгасных мас павінны займаць неаслабную ўвагу ва ўсёй рабоце партарганізацый.

КП(б)Б забясьпечыла сваёй бальшавіцкай работай бліскучыя перамогі пістарычнай важнасьці на фронце сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Задачай партарганізацый зьяўляецца замацаваць дасягнутыя посьпехі, сканцэнтраваць галоўную ўвагу на арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Барацьба за высокую таварнасьць калектыўнай гаспадаркі, за правільную арганізацыю працы, за перавыкананьне калгасьніка «ў сапраўднага трудзяніка сацыялістычнага грамадзтва» патрабуе ад кожнай вясковай партарганізацыі перабудовы партыйнай работы, працальнай расстаноўкі сіл, апэрацыйнасьці ў кіраўніцтве. Кулацкія элементы, ня здолёўшы затрымаць бяднацка-серадняцкія масы ад уступленьня ў калгасы, зьмянілі тактыку сваёй варожай дзейнасьці, імкнуцца падрываць калгасную вытворчасьць, разбураць калгасы з сярэдзіны. Неабходна павялічэньне клясавай пільнасьці, узмацненьне работы ўсіх парт'ячэек па мабілізацыі калгасных і бяднацка-серадняцкіх аднаасобных мас на бязьлітасную барацьбу з кулаком і яго агентурай—правым і «левым» апартунізмам. Ажыццяўляючы вузлавую задачу калгаснага руху, задачу арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, кожная вясковая парт'ячэйка павінна «сурова і непрымірыма змагацца супроць стаўкі на самацёк у калгасным будаўніцтве і супроць пагоні за дутымі процантамі ў калектывізацыі».

Трэба добра ўсьвядоміць, што толькі на аснове арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў стымулюцца далейшыя посьпехі калгаснага будаўніцтва і завяршэньня суцэльнай калектывізацыі.

Перавыбарчая кампанія парторганаў павінна забясьпечыць значнае паляпшэньне работы вясковых партарганізацый, узьняць на вышэйшую ступень кіруючую ролю кожнай парт'ячэйкі ў справе сацыялістычнай перабудовы вёскі і выкананьня бягучых гаспадарча-палітычных кампаній.

Паводле дырэктыў ЦК КП(б)Б з 5 па 15 лістапада праводзіцца масавая самаправерачная работа парт'ячэек. З 15 лістапада пачынаюцца ўжо перавыбары бюро ячэек. Зараз-жа на першых сходах ячэек трэба шырока абмеркаваць дырэктыўны ліст ЦК аб перавыбарах, давесьці яго да кожнага партыйца. Для перанясеньня вопыту работы перадавых прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў неабходна пэфэствуючым ячэйкам зьвязацца з падпэфнымі, арганізаваць узаемную дапамогу ў правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі парторганаў. Гаркомы і райкомы па куставых сходах ячэек робяць справаздачныя даклады аб сваёй рабоце. На сходах рабочых і калгасьнікаў неабходна паставіць даклады ячэек аб бліжэйшых задачах партарганізацый.

Справаздачна-перавыбарчыя сходы ячэек павінны быць адкрытымі. На іх трэба максымальна прыцягнуць беспартыйных рабочых і калгасьнікаў.

Усе сходы павінны праводзіцца пад лёзунгам разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі і ня большага павышэньня ўнутрыпартыйнай дэмакратыі.

Дырэктыўны ліст ЦК КП(б)Б аб перавыбарах парторганаў—баявая праграма работы ўсіх зьвеньняў партарганізацыі ў новых умовах і абстаноўцы. На выкананьне задач, паставленых Цэнтральным Камітэтам, павінны пабальшавіцку мабілізаваць кожная партарганізацыя, кожная ячэйка КП(б)Б.

Халошэніцкі сельпартком са сваімі задачамі ня справіўся

Халошэніцкі сельпартком абслугоўвае 6 партыйных ячэек з агульным лікам 100 членаў і кандыдатаў партыі. Сельпартком ня толькі не забясьпечыў баявых тэмпаў у рабоце партыйных ячэек, а нават не дабіўся належнай пастаноўкі работы ў тым саўгасе, які сам непасрэдна абслугоўвае.

На радзе адказьнейшых вучасткаў работы (выкананьне пляну зяблёва, сілаваньне і інш.) глыбокія прарывы.

Сельпартком не разгарнуў работы па марксыцка - ленінскім выхаваньні партыйных мас. Не забясьпечана штодзённае кіраўніцтва і ячэйкамі камсамолу.

Прычына такога становішча хаваецца ў тым, што кіраўніцтва сельпарткому, у прыватнасьці сакратар тав. Аляксееў, не зразумеў тых задач, якія ставіць партыя перад сельпарткомам. Раённы камітэт партыі пастанавіў абнавіць кіраўніцтва сельпарткому, паслаўшы туды другога таварыша.

Справаздачна - перавыбарчая кампанія павінна мабілізаваць усю партарганізацыю на ажыццяўленьне лёзунгу аб пераўтварэньні саўгасаў і МТС у сапраўдны апорныя пункты партработы на вёсцы.

Алімор.

Батуньская парт'ячэйка—у палоне апартуністычнай практыкі

Ячэйка КП(б)Б саўгасу «Батунь» (Магілёўскі раён), налічвае ў сваім складзе каля 10 партыйцаў. У саўгасе досыць вялікі рабочы актыў. Умовы для работы надзвычай добрыя, але ячэйка іх не скарыстала для разгортваньня сваёй практычнай дзейнасьці па ажыццяўленьні тых задач, якія перад ёю ставіла партыя.

Парт'ячэйка не кіравала вытворча-гаспадарчым жыцьцём, у рэзультаце чаго ў саўгасе надзвычайна глыбокія прарывы ў правядзеньні асноўных палітычна-гаспадарчых кампаній. Парт'ячэйка не мабілізавала мас рабочых на ажыццяўленьне пастановы ЦК і СНК аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Перад саўгасам была пастаўлена задача ўкамплектаваць стада 300 штук прадукцыйных кароў. Гэта важнейшая задача ня выканана. Пастаўлена толькі 103 каровы, або план выканан усяго толькі на 33 проц. Будаўніцтва дзьвёх абораў на 300 штук жывёлы пад пагрозай зрыву. На будаўніцтве працуюць кулацкія і сацыяльна-варожыя элементы (Салкін і Мяжэвіч). Адміністрацыя ня ўжыла ніякіх мер для таго, каб скарыстаць унутраныя рэсурсы для пасьпяховага правядзеньня будаўніцтва.

Вялікія прарывы і ў правядзеньні сельска-гаспадарчых работ. У другой палове кастрычніка яшчэ стаяла 5 га сенажаці. Згніло на полі 5 га жыта. Пагніў ячмень на плошчы 7 з паловаю га, авёс і буракі на плошчы 4 га.

У саўгасе не арганізавана праца. Барацьба за якасьць работы не стаяла ў цэнтры ўвагі партыйнай ячэйкі. Отагі сена складаліся на нізкім месцы. У рэзультаце 2 стагі надмочаны вадою і калы 2-х тысяч пудоў сена прапала. За шесьць месяцаў у саўгасе было больш 50 ацёлаў кароў. З гэтай колькасьці ў сувязі з дрэнным доглядам, 25 штук маладняка пала. Тыя, што засталіся, на працягу цэлага лета былі бяз догляду, толькі выганяліся на выпас. Аборы знаходзяцца ў хаатычным становішчы. Даяркі на раз патрабавалі ачысьціць хляўні ад гною, аднак, на іх патрабаваньні не рэагавала ні адміністрацыя ні парт'ячэйка. Гэта ўсё прывяло да надзвычайна нізкай прадукцыйнасьці. У сярэднім ад адной каровы ў дзень выдойваецца толькі каля 4-х літраў малака.

Ня зледзячы на вялікую патрэбу ў кармох, план сілаваньня выкананы толькі на 25 проц., у той час, як бульбоўнік на плошчы 32 га загніў на полі.

План зяблёва выканан на 10 проц.

Прычына прарываў заключаецца ў тым, што партыйная ячэйка ня толькі не начала працаваць па-новаму, а па працягу апошніх 3-х месяцаў абсалютна бязьдзейнічала. У самы разгар правядзеньня адказьнейшых работ (ліпень—верасень) партыйная ячэйка ні разу ня збіралася. Кіраўнік парт'ячэйкі і ён-жа загадчык саўгасу КАЗАК заціскаў самакрытыку, скаціўся ў балота апартуністычнай практыкі. На бюро ячэйкі часамі і ставіліся пытаньні вытворчага характару, аднак, пастановы па іх прымаліся агульныя і не мабілізавалі мас на ліквідацыю тых прарываў, якія мелі месца ў саўгасе. Праверкі выкананьня пастаноў ніякай ня было.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна мабілізаваць усю партыйную масу на ліквідацыю тых прарываў, якія мелі месца ў саўгасе «Батунь». Задача ячэйкі — ачысьціць свае рады ад апартуністаў, перабудаваць сваю работу па-новаму, у цэнтры ўвагі паставіўшы пытаньні арганізацыі працы на аснове зьдзельшчыны, дабіцца ліквідацыі абязьлічкі і павышэньня якасьці работы на ўсіх вучастках.

Прахарэнка, Майсеенка.

ФАРСАВАЦЬ СКАНЧЭНЬНЕ БУДАЎНІЦТВА

і прыстасаваньне памяшканьняў для сьвіней і кароў

Жывёла памяшканьнямі не забясьпечана

ЧАШНІКІ. Двухмесячнік жывёлагадоўлі чашніцкія раённыя арганізацыі не скарысталі для таго, каб своечасова закончыць камплектаваньне калгасных таварных фэрм, поўнасьцю выканаць план будаўніцтва і стварыць аднаведныя ўмовы для зімоўкі калгаснага стада.

Парт'ячэйкі і сельсаветы не разгарнулі масавай растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Гістэрычная адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР абмяркоўвалася ў нязначнай частцы калгасаў. Райвыканком і райкалгасаюз не аказалі практычнай дапамогі калгасам.

У выніку плян камплектаваньня малочных таварных фэрм выканан усяго на 32 проц.; замест 11 фэрм арганізавана 9, замест 1.300 кароў на фэрмы пастаўлена 414. План здачы таварнай прадукцыі выканан фэрмамі ўсяго на 19 проц.

Калгас «Чырвоная Слабада» мае 86 штук буйной рагатай жывёлы, але стада ўтрымліваецца вельмі дрэнна. Удой малака ўлетку ў сярэднім быў 4—4 з палавою літры. Уліку надоенага малака не вядзецца.

Не засілаванa ні аднай тоны. Работнікі фэрмы не пераведзены на зьдзельшчыну.

У калгасе Грынькі, Лазоўскага сельсавету, на фэрме ёсьць 65 дойных кароў і 55 штук маладняка. Нічога ня робіцца ў забясьпячэньні жывёлы кармамі. План сілаваньня сарваны.

У сьвінагадоўчых калгасах будаўніцтва сьвінарнікаў яшчэ далёка на скончана. У камуне «Чырвоны барацьбіт» пачалі будаваць сьвінарнік у мінулым годзе, але і зараз ён яшчэ не гатовы. 424 штукі сьвіней трымаюцца ў антысанітарных умовах. У калгасе «10-ты Кастрычнік» 226 сьвіней утрымліваюцца ў адным невялікім памяшканьні. Былі выпадкі, калі сьвіньні зьядалі парасят. Будаўніцтва сьвінарніка, ня зледзячы на гэта, яшчэ ня скончана. У калгасе «Свабода» 7 тыс. рублёў, атрыманыя на будаўніцтва сьвінарніка, скарыстаны на іншыя мэты. Райкалгасаюз будаўніцтвам у калгасах ня кіруе, няма нават асобы, якая-б адказвала за гэту справу.

План сілаваньня па раёне выканан толькі на 43,8 проц.

Паданыя факты паказваюць, што жывёлагадоўля яшчэ па-за ўвагай раду чашніцкіх раённых арганізацый. З апартуністычнай падацэнкай жывёлагадоўлі неабходна рашуча пакончыць. Неабходна зараз-жа ўжыць рашучыя меры, каб забясьпечыць адпаведныя ўмовы для зімоўкі жывёлы.

М. Агністы.

Вынікі злачынкага ігнараваньня дырэктыў партыі

МАГІЛЁЎ. Кіраўніцтва жывёлагадоўчага саўгасу Багунь, Гусьлічанскага сельсавету, давяло саўгас да раду буйнейшых прарываў. У саўгасе будуюцца 2 аборы, адна на 100, а другая на 200 штук. Будаўніцтва пад пагрозай зрыву. Няма ўпэўненасьці ў тым, што яны будуць скончаны да наступленьня марозаў. Будаўніцтвам кіруюць кулакі Міжэвіч і Сазанін.

У выніку галавацяпскага кіраўніцтва, апартуністычнай недаацэнкі сіласу, план сілаваньня выканан толькі на 25 проц. На плошчы 92 гакт. загніў бульбяник.

План камплектаваньня выканан усяго на 33 проц. Замест 300 прадукцыйных кароў, набыта 103. Каровы даюць вельмі мала малака. Гэта вынік незадавальнасьці адміністрацыі гаспадаркай, вынік поўнай абязьлічкі. Далькі не прымацаваны да жывёлы, што не дае магчымасьці паляпшыць дагляд яе.

Неабходна прыцягнуць да суровай адказнасьці кіраўніцтва саўгасу, якое ігнаруе дырэктывы партыі і ўраду аб разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Трэба саўгасную масу мабілізаваць на штурм прарываў, каб саўгас спаткаў зіму падрыхтаваным.

Майсеенка.

На працягу лістапада-сьнежня

СКТФ павінны поўнасьцю выканаць свае абавязкі перад дзяржавай

7 раёнаў злачынна адстаюць

На 1-га лістапада сьвінагадоўчымі фэрмамі і калгасамі БССР здана дзяржаве 2.974 сьвіней. План здачы таварнай прадукцыі выканан усяго на 26,3 проц. пляну. Такім чынам ход важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі праходзіць яўна нездавальняюча.

Асноўная прычына гэтага ў тым, што рад раённых арганізацый правялі палітычную недаацэнку справы разгортваньня здачы таварнай прадукцыі калгасамі, прадставіўшы ход кампаніі апартуністычнаму самацёку.

Некаторыя раёны праявілі абсалютную бязьдзейнасьць. Замест разгортваньня масавай работы, мабілізацыі калгаснай грамадзкасьці на выкананьне пляну, на аснове сацспаборніцтва раёну з раёнам, фэрмы з фэрмай, ня прымалі ніякіх мер для ўмацаваньня здачы таварнай прадукцыі, а некаторыя раённыя арганізацыі займаліся разважаньнямі аб «нерэальнасьці» пляну. Па такіх разьнах мы маем ганебны зрыў пляну. Так, фэрмы Веткаўскага раёну далі ўсяго 19 штук, Жыткавіцкага — 19, Тураўскага — 29, Нараўлянскага — 12, Церахаўскага — 20, Магілёўскага — 76, Уваравіцкага — 31.

Побач з гэтым трэба адзначыць, што рад раёнаў у выніку мабілізацыі калгасных мас на выкананьне пляну, дабіўся значных посьпехаў у здачы таварнай прадукцыі. Так, Слуцкі раён здаў 1.116 штук, Мсьціслаўскі — 504, Аршанскі — 410, Менскі — 340, Талачынскі — 303, Полацкі — 326, Чэрыкаўскі — 290.

Раўняючыся па перадавых раёнах, усе адстаючыя павінны неадкладна дабіцца рашучага пералому, каб на працягу лістапада-сьнежня месяцаў план здачы сьвіней быў выканан поўнасьцю. Трэба зараз-жа прыступіць да разгортваньня адкормачных апэрацый, дабіваючыся ў першую чаргу здачы ўсіх адкормленых таварных сьвіней.

Неабходна давесьці да ўсіх СКТФ і калгасаў памесячныя заданьні па пастаноўцы на адкорм і здачы дзяржаве сьвіней пад асабістую адказнасьць загадчыкаў СКТФ і старшынь калгасаў.

Усе фэрмы і калгасы абавязаны паставіць на адкорм усіх выбракаваных матак і кныроў, усіх кастраваных кабанчыкаў, якія дасягнулі 4-хмесячнага ўзросту.

Павінен быць устаноўлен суровы кантроль за здачай таварнай прадукцыі, прыцягваючы да адказнасьці вінаватых у разбазарваньні яе, як за раскрадваньне таварнай маемасьці.

На аснове шырока разгорнутага сацспаборніцтва і мабілізацыі ўсёй грамадзкасьці раёну заданьне трэба і можна выканаць у тэрмін.

М. СТРАМОК.

Зьняцьце з працы і вымовы

за невыкананьне пляну здачы таварнай прадукцыі

У загадзе па беларускім аддзяленьні Сьвінаводтрэсту канстатуецца, што, ня гледзячы на зусім выразныя пастановы партыі і ўраду аб вялізарным значэньні здачы дзяржаве сьвінафэрмамі і калгасамі таварнай прадукцыі сьвіней, гэта важная гаспадарча-палітычная справа радам калгасаюзаў і райпуўнаважаных Сьвінаводкалгасцэнтру апартуністычна недаацэньвалася. Ніхто ёю не кіраваў; справа была прадастаўлена самацёку.

Упаўнаважаны аддзяленьня Сьвінаводкалгасцэнтру па Брагінскім раёне тав. Рыбкін за абсалютную бязьдзейнасьць у справе выкананьня вытворчай праграмы па СТКФ, ігнараваньне дырэктыў беларускага аддзяленьня СКЦ і няпрыняцьце мер да правядзеньня двухмесячніка жывёлагадоўлі (сарваны) — зьнімаецца з работы з абвяшчэньнем вымовы.

За зрыў пляну здачы таварнай прадукцыі і абсалютную бязьдзейнасьць у справе камплектаваньня упаўнаважаным Сьвінаводкалгасцэнтру: па Веткаўскім раёне тав. Каршунаву, па Уваравіцкім раёне тав. Блюміну, па Рагачоўскім раёне тав. Нікалаеву і па Смалявіцкім раёне тав. Сьцясловічу — абвяшчаецца суровая вымова з папярэджаньнем.

За бязьдзейнасьць у справе здачы таварнай прадукцыі, няпрыняцьце мер адгрузкі сьвіней для магазынаў Сьвінаводкалгасцэнтру і нядбайныя адносіны да зоатэхнічнага абслугоўваньня СТКФ —упаўнаважанаму па Магілёўскім раёне тав. Глускеру абвяшчаецца вымова і зоатэхніку тав. Лукашову — суровая вымова з папярэджаньнем.

За недапушчальна нядбайныя адносіны і бязьдзейнасьць у ажыццяўленьні мерапрыемстваў партыі і ўраду па тавар па-калгаснай сьвінагадоўлі ўпаўнаважаным Сьвінаводкалгасцэнтру: па Жыткавіцкім раёне—т. Кірбаю, па Заслаўскім — тав. Шалаховічу, па Крычаўскім — тав. Таганові чу, зоатэхніку—т. Зайцаву, па Чырвона-Слабодзкім — тав. Пінчуку, па Пятрыкоўскім — тав. Рудзенку, па Старобінскім — тав. Курбіку, па Любаньскім — тав. Гальчэні і зоатэхніку тав. Сідаровічу, па Нараўлянскім — зоатэхніку тав. Каленіку — абвяшчаецца вымова.

Упаўнаважаныя іншых раёнаў папярэджваюцца, што такому недапушчальнаму становішчу са здачай таварнай прадукцыі сьвіней і камплектаваньнем павінен быць пакладзен канец. Раёнам прапануецца ажыццявіць рад канкрэтных мерапрыемстваў.

Гаркому КП(б)Б, Гарсавету, Гарпрафсавету

Рапарт

Менскае аддзяленьне Дзяржбанку ўдарнымі тэмпамі і мэтадамі сацспаборніцтва 29-га кастрычніка датэрмінова выканала план мабілізацыі сродкаў за кастрычнік месяц на 103,9 проц. заданьня, па пазыкы «Трэці рашаючы»— на 111,5 проц.

Запэўняем, што пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі мы поўнасьцю выканаем план мабілізацыі сродкаў за чацьверты квартал.

Кіраўнік Менскага аддзяленьня Дзяржбанку КЕЙЛІН.
Сакратар парт'ячэйкі БАЙРАШЭЎСКІ.
Старшыня мясцкому ФІЛІПОВІЧ.

Цагельня ў Пятрыкове пабудавана

ЦК КП(б)Б—тав. Гею, СНК БССР—т. Галадзеду, ВСНГ БССР—тав. Грысевічу, „Зьвязда"—т. Будзінскаму

ПЕРАМАГАЮЧЫ ЎСЕ ПЕРАШКОДЫ НА СВАІМ ШЛЯХУ, НЯЎХІЛЬНА ВЫКОНВАЮЧЫ ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ НАШАЙ ПАРТЫІ, НАПРУЖАНАЙ ПРАЦАЙ РАБОЧЫХ І ТЭХПЭРСАНАЛУ Ў ПЯТРЫКОВЕ ЗАКОНЧАНА ПАБУДОВАЙ МАГУТНАЯ МЭХАНІЗАВАНАЯ ЦАГЕЛЬНЯ, ЯКАЯ ДАСЬЦЬ НАШАМУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАМУ БУДАЎНІЦТВУ 8,5 МІЛЬЁНАЎ ШТУК ЦЭГЛЫ Ў ГОД.

НЯХАЙ ЖЫВЕ СТАЛЁВЫ ЦК НАШАЙ ПАРТЫІ!
НЯХАЙ ЖЫВЕ XIV ГАДАВІНА КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ!

Райком КП(б)Б НОВІКАЎ,
Райвыканком МАРКЕВІЧ,
Райпрафсавет ЛУК'ЯНОВІЧ,
Дырэктар заводу БАРКОЎСКІ.

Х. Дунец

...му крывая так павольна ўзьнімаецца ўверх?

II.

...адзачы да некаторых заўваг аб ...рабоце на Добрускай фабрыцы ...працы», мне хочацца ўспамя... ...адной заметцы ў адным з апош... ...ароў «Праўды» дзе паведамля... ...го на Сталінскім металюргічным ...штодзённа ў некаторых цэхах ...ацца табліцы заработнай пла... ...го гэтыя таблицы маюць вялізар... ...стымулюючае значэньне ў спра... ...цьбы за прамфінплян. Гэта — ...тад, які паказвае, што пры ўме... ...таваўцы масавай работы на прад... ...вах і апэрацыйным прыстасава... ...не сыстэмы да высунутых пар... ...ёўнаў, — у даным выпадку ...е датычыць перабудовы сыстэ... ...аботнай платы — масавая рабо... ...ца вялізарнай рухомай сілай у ...е за прамфінплян.

...гэтыя формы масавай апэрацый... ...боты адсутнічаюць на Добрускай ...ай фабрыцы. Ні прыходзіцца ...арыць аб выкарыстаньні ў ма... ...рабоце вопыту пазаганага Сталін... ...та заводу; хутчэй можна было-б ...ь, што ў справе зарплаты існуе ...ямала хвасьцізму, вараменьне пра... ...растлумачыць рабочым сэнс на... ...ў партыі, што ёсьць элементы ...істычнай боязні барацьбы суп... ...дробна-буржуазнай ураўнілаўкі, ...ват такія фэрмы масавай ра... ...ыя ў нас ужо ўвайшлі ў быт ...ў і фабрык, на Добрускай фабры... ...ае не набылі права грамадзянства. ...дошак пасутачнай выпрацоўкі цэ... ...рыгад, машын; няма чырвонай і ...дошак, якія павінны былі быць, ...ообных цэхах, так і ў клюбе, «у ...ні», у заводакіраўніцтве, дзе заў... ...шмат рабочых. У паасобных цэхах ...кі, асабліва ў паккамэры, якая ...чаецца ў вялікіх сьветлых па... ...аньнях, дзе ёсьць шмат лёзунгаў, ...ягнутых паміж сьценамі, але ні адзін рабочы не прачытае па гэтых лёзунгах, што яму канкрэтна трэба зрабіць у рабоце свайго цэху, як стаіць справа з выкананьнем яго прамфінпляну, хто ў цэху зьяўляецца добрым ударнікам, хто зрывае прамфінплян. Гэтага няма! Недзе сіраталіва вісіць дошка з адзнакамі былога жыцьця, недзе за цокамі валяюцца ў мінулым упрыгожаньня, а зараз забруджаныя дошкі насьценных газэт. Вельмі мала можна ў цэхах знайсьці такога, што-б нагадвала аб сёньнішнім дні, аб ударнай рабоце, аб спаборніцтве брыгад і зьмен, аб ганебным дзеяньні прагульшчыкаў і г. д. і інш.

Такое-ж становішча ў клюбе. Вялізарны клюб з вялікай прапускной здольнасьцю, з вялікай колькасьцю пакояў, з вялікай залай для лядачоў. Аднак, клюб больш за ўсё зьяўляецца камэрцыйным прадпрыемствам — ён інтэнсыўней за ўсё выкарыстоўваецца стаціянарным кіно, дзе ў звычайным парадку і ў парадку чарговасьці ставяцца «спотшибательные» амэрыканскія баявікі. На вечарох у калідорах клюбу моладзь забаўляецца, не находячы сабе справы для мэтазгоднага выкарыстаньня свайго вольнага часу. Па сьценах клюбу разьвешаны лёзунгі. Але дарэмна вы шукалі-б у гэтых лёзунгах якой-небудзь адзнакі таго, што гэты клюб зьвязан з фабрыкай і зьяўляецца яго цэхам, што даны клюб агітуе і прапагандуе за высокія тэмпы ў папяровай прамысловасьці і г. д. і інш. Гэта зусім не адлюстроўваецца ў рабоце клюбу і вялікія магчымасьці застаюцца нявыкарыстанымі.

Некаторыя работнікі Добрушу гаворацьць, што на даклады ў клюб ня хоўзьць. Мне ня прышлося прысутнічаць на дакладах, якія наладжваліся ў клюбе, і таму не магу сказаць ці праўда гэта. Аднак, праведзеная канфэрэнцыя рабочых па заключэньні сацдагавору з падшэфнай вайсковай часьцю сабрала многа рабочых. Людзі, відаць, не думаліся да таго, што Добруш можа сабе дазволіць, каб у сьцепах яго клюбу чыталі цікавыя лекцыі спэцыялісты ў галіне папяровай прамысловасьці, якія заўсёды ў наяўнасьці, не падумалі аб тым, што для работы клюбу можа і павінен быць выкарыстаны кадр марксыстаў і навуковых работнікаў Гомеля.

Атрымліваецца, такім, чынам, што асноўная зброя клюбнай работы — вусная агітацыя і прапаганда, відовішчы, работа з кнігай, тэхнічная вучоба — зусім закінуты. Бібліятэка клюбу, якая мае каля 8.000 кніг, страціла каля 50 проц. сваіх кніжных рэсурсаў і ніяк ня можа іх сабраць.

Тое-ж самае можна сказаць пра радыёўстаноўку, якая існуе пры фабрыцы. Гэта ўстаноўка больш за ўсё выкарыстоўваецца для трансьляцыі Масквы і Менску, але ў зусім нязначнай меры выкарыстоўваецца ў мэтах барацьбы за прамфінплян фабрыкі.

Адзіная сьветлая пляма на змрочным фоне масавай работы ў Добрушы гэта друкаваная газэта «Чырвоная бракамолка». Гэта газэта, невялікая па сваім фармаце, выдаецца штодзённа і працуе арацыйна. Яна мае вакол сябе каля сотні карэспандэнтаў. Яна пачынае наладжваць, хоць і навольнымі тэмпамі, агульнаазводкую сыстэму насьцегазэтштодзённак. Асноўная бяда газэты — наяўнасьць значнага элемэнту самацёку, невыстарчальнай работы па арганізацыі мас.

Адсутнасьць сыстэматычнай і поўнакроўнай масавай работы асабліва дае сябе адчуваць у справе сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Паасобныя добрыя крокі ў тым ці іншым цэху або брыгадзе не пераведзьмяюцца і не пераносяцца на ўсё прадпрыемства. Яны застаюцца над спудам. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва ня мае ўліку, няма кантролю над выкананьнем узятых абавязацельстваў, што павінна было быць задачай масавай работы прафсаюзнай арганізацыі. Да рэчы кажучы, прафсаюзная работа толькі зараз пачынае ажыўляцца, новае прафкіраўніцтва толькі-толькі намацоўвае сваю нізавую сетку, пэхкомы вядуць вельмі слабую масавую работу.

Ясна, што такі стан мае цэлы рад «тлумачэньняў», ёсьць так званыя «аб'ектыўныя» прычыны. Паасобныя работнікі проста недаацэньваюць гэту галіну арганізацыі мас. Характэрна, што калі было высунута пытаньне аб тым, каб вакол прыведзенага мною ў першым артыкуле выпадку аб псаваньні дзесяці катлоў цэлюлёзы, правесьці масавую работу па ўсіх цэхах, — загадчык арганізаўдзелу парткому тав. Асятроў выказаў сумненьне ў мэтазгоднасьці гэтай меры, бо выпадак, моў, датычыць асобнага цэху і яго спэцыфічных умоў работы. І гэта, ня гледзячы на тое, што прычыны выпадку на СЦЗ зьяўляюцца тыповымі для ўсёй работы фабрыкі.

У паасобных работнікаў Добрушу недаацэнка масавай работы зьвязана з няправільным падыходам да рабочай масы наогул. Ёсьць людзі, якія падтрымліваюць абывательскія разгаворчыкі аб тым, што «з дабрушанамі далёка не заедаеш», што «ў Добрушы работу не паставіш». Пры гэтым спасылаюцца на цэлы рад «мясцовых умоў». Занадта ўжо гэтыя таварышы падкрэсьліваюць «асабліва» цяжкія ўмовы, «асобны» склад рабочых, «асабліва» гістарычныя ўмовы фабрыкі і г. д. і інш. Гэтым яны ўкосна выпрошваюць нейкую «скідку» для слабе. Гэты «тэзіс» у корані сваім зьяўляецца апартуністычным. Супроць гэтага «тэзісу» парткіраўніцтва фабр

Узорна правесьці перавыбары ФЗМК

У ВАРАШЫЛАУЦАЎ МОЖНА ВУЧЫЦЦА

Перавыбары сталі сапраўды масавай палітычнай кампаніяй

Пад знакам ажыццяўлення шасьці ўмоў тав. Сталіна ідзе канкрэтная перабудова работы заводу

Перавыбарчая кампанія цэхкомаў і заўкому па заводзе імя Варашылава стала сапраўды вялікай масавай палітычнай кампаніяй, заводзкія арганізацыі паставілі сабе мэтай цалкам мабілізаваць масы рабочых і ўдарнікаў заводу на барацьбу за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну і рэалізацыю 6 умоў тав. Сталіна. Гэта кампанія сутнала з масавай самаправеркай выкананьня прамовы правадыра нашай партыі тав. Сталіна—сталінскай эстафэтай падрыхтоўкі да Кастрычніцкіх сьвят. Усе гэтыя кампаніі былі ўключаны ў адзін агульны паход за перабудову працы, за выкананьне ўмоў работы пакаму, за поўную ліквідацыю запазычанасьці па прамфінпляне.

Пачаткам усёй кампаніі служылі масавыя мерапрыемствы—сходы па цэхах, брыгадах, групах, якія мабілізавалі рабочых на штурм новых мерапрыемстваў. Былі праведзены гутаркі, нарады па цэхах з рознымі катэгорыямі рабочых.

На пашыраным пасяджэньні заўкому быў зацьверджан план перавыбараў. Праведзена нарада старшынь цэхкомаў, яе поўнасьцю абмеркавана інструкцыя па перавыбарах і плян работы.

Гэта нарада і была пачаткам разгорнутай самаправеркі. Па ўсіх цэхах і групах пачалася вярбоўка ў самаправерачныя брыгады. На працягу двух дзён было арганізавана 86 самаправерачных брыгад з колькасьцю добраахвотнікаў у 378 рабочых-ударнікаў.

Кожная брыгада мае свой вучастак работы, правяраe адно якое-небудзь пытаньне. Апрача агульнай праверкі, на брыгаду ўскладзен абавязак практычна дамагчы ў правядзеньні новых мерапрыемстваў, указаных у распрацаваных 6 ці маршрутах па сталінскай эстафэце. Дзякуючы такой пастаноўцы работы, на заводзе наглядаецца вялікая актыўнасьць у справе ажыцьцяўленьня прамовы тав. Сталіна.

Апрача таго быў праведзен зьлёт ударнікаў заводу, на якім прысутнічалі звыш 600 рабочых-ударнікаў, дзе было абмеркавана пытаньне аб перавыбарах заўкому і выкананьні прамфінпляну. Быў праведзен агульны сход старых рабочых, на якім прысутнічала 200 ударнікаў; на сходзе былі абгавораны пытаньні аб выкананьні прамфінпляну, задачах IV кварталу і аб перавыбарчай кампаніі. Каля 20 рабочых выказаліся аб недахопах работы заводу, цэху, брыгады. Была прынята рэзалюцыя, якая цалкам і поўнасьцю прызнае магчымым стопроцантнае выкананьне і нават перавыкананьне прамфінпляну. Для гэтага, — прапанавалі рабочыя, — трэба канчаткова зьнішчыць непаладкі на цэхах, у брыгадах (плянавыя няўвязкі паміж абточкай і зборкай), зьнішчыць абязьлічку, ураўнілаўку (на 27-м варштаце токары 2 разраду зарабляюць больш, чым токары 5-га), укараніць брыгадны гаспадарчы разрахунак, палепшыць культбытавыя ўмовы рабочых і ІТР.

На вечары старых рабочых было ўпесена 86 рацыяналізатарскіх прапаноў, 11 старых рабочых уступілі ў ленінскую партыю, старыя рабочыя заводу абяцалі прыняць актыўны ўдзел у самаправерачнай рабоце цэхкомаў і заўкому і перадаць вопыт сваёй работы маладым рабочым.

У выніку разгорнутай масавай работы ім дабіліся значнага росту паступленьня рабочых рацыяналізатарскіх прапаноў, уступленьня ў партыю, у камсамол, росту членаў саюзу за лік новых рабочых і г. д.

За час падрыхтоўкі да перавыбараў (15—30 кастрычніка) паступіла рабочых прапаноў 256. У саюз уступіла 155 рабочых. Некаторыя цэхі (інструментальна-рамонтны, 4-я група токараў) поўнасьцю ахоплены прафчленствам. Паступіла заяў у партыю 39, у камсамол—33. Праведзены на гаспадарчых разрахунак яшчэ 12 брыгад і 12 такарных варштатаў, якія адначасова пераводзяцца на прагрэсыўна-прэміяльную сыстему аплаты працы.

Асаблівая ўвага ў часе самаправеркі зварачаецца на паляпшэньне сацыяльна-бытавых умоў рабочых. Хутка будзе адкрыта яшчэ адна цэхавая сталовая для токараў, адкрываюцца новыя два буфэты, поўнасьцю выдана норма бульбы ўсім рабочым, вядзецца ўзмоцненая барацьба за поўную выдачу нормы дроў. Значна палепшылася становішча ў інтэрнаце, уведзена электрычнасьць, радыёфікацыя і г. д. Некаторыя групы рабочых узялі шэфства над паасобнымі вучасткамі сацыяльна-бытавой работы. 4-я група токараў узяла шэфства над шавецкай і кравецкай майстэрнямі, 1-я група токараў узяла шэфства над сталовай і буфэтам, 2-я група—над заводзкай цырульняй і г. д. Гэта новая форма рабочага кантролю дасьць магчымасьць палепшыць якасьць работы як сталовай, так і розных майстэрань.

Асабліва трэба адзначыць ролю друку, які па заводзе, у сувязі з перавыбарамі прафорганаў, значна вырос. Замест 16-ці штодзенных газэт на 30 кастрычніка ёсьць ужо 21, якія кожны дзень зьмяшчаюць матар'ял аб перавыбарах, прапановы, вядуць рэкамэндацыйны сьпісы новага складу цэхкомаў і заўкому. Шматпаражка «Чырвоны молат» за гэты час выпла ўжо тры разы, зьмяшчаючы матар'ял аб перавыбарах прафарганізацыі.

Партарганізацыя заводу прыняла пастанову аб перавыбарах прафарганізацыі. Прапанавана партыйным ячэйкам прыняць актыўны ўдзел і кіраваць работай самаправерачных брыгад, заслухаць справаздачы цэхкомаў і г. д. Але, на жаль, некаторыя ячэйкі, як інструментальна-рамонтнага цэху, сьлясарна-зборачнага, кацельнага, яшчэ не ўсьвядомілі важнасьць гэтай кампаніі і цягнуцца ў хвосьце цэхкомаў, а некаторыя з іх зусім на цікавяцца справай перавыбараў.

Камсамольская арганізацыя наогул слаба ўключылася ў перавыбары. Некаторыя ячэйкі, як інструментальнага цэху, такарных груп, вядуць некаторую работу па самаправерцы, але ўся камсамольская арганізацыя бязвора ўдзелу ў самаправерцы ня прымае.

Да 30 кастрычніка былі праведзены перавыбары прафгрупоргаў, зборшчыкаў членскіх узносаў і групавых вытворчых арганізатараў. Выбрана прафоргаў 35, зборшчыкаў — 33 і 36 вытворчых арганізатараў. Трэба адзначыць асаблівую актыўнасьць рабочых у брыгадах, стопроцантную яўку на сходы брыгад, учыненьне канкрэтных прапаноў па паляпшэньні работы брыгад.

Зараз на заводзе пачынаюцца справаздачныя сходы цэхкомаў. Трэба, каб варашылаўцы з большай настойлівасьцю выявілі ўсе недахопы ў рабоце цэхаў і ўсіх тых, хто затрымлівае выкананьне баявых плянаў.

Я. ЗСТЭРКІН.

Лепшыя ўдарнікі ідуць у партыю

На заводзе «УДАРНІК» справаздачна - перавыбарчая кампанія ўнесла значнае ажыўленьне ў работу арганізацыі. Для праверкі работы заўкому створана 16 добраахвотных брыгад, у якіх прымае ўдзел звыш 120 чалавек. 5 лепшых рабочых-ударнікаў падалі заяву аб прыёме іх у рады партыі, 17 рабочых—у прафсаюз, 21 чалавек уступіў у камсамол. 3 брыгады пераведзены на гаспадарчы разрахунак.

Рабочыя заводу «ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК» выклікалі завод «БАЛЬШАВІК» на сацспаборніцтва па лепшым правядзеньні справаздачна - перавыбарчай кампаніі. На заводзе арганізаваны 19 брыгад для праверкі дзейнасьці заўкому. 25 рабочых-ударнікаў падалі заявы аб прыёме іх у партыю. Прынята ў прафсаюз 50 чалавек. Узрасла актыўнасьць рабочых.

За гэты час ударнікі ўнесьлі 47 рацыяналізатарскіх прапаноў. 8 брыгад перайшлі на гаспадарчы разрахунак.

На швэйнай фабрыцы «КАСТРЫЧНІК» у часе прапрацоўкі адозвы УсеЦСПС аб перавыбарах заўкому 12 ударных брыгад патрэбавалі перавесьці іх на гаспадарчы разрахунак.

Зусім невыстарчальна праводзіцца падрыхтоўчая работа да перавыбараў фабзаўкомаў на ХЛЕБАЗАВОДЗЕ, ШПАЛЕРНАЙ І АБУТКОВАЙ ФАБРЫКАХ.

На „Спартаку" ўсё спакойна...

На шклоўскай папяровай фабрыцы «Спартак» справаздачна - перавыбарчая кампанія фабкому не дала належнага зруху ў справе выкананьня прамфінпляну. Падрыхтоўчая работа да перавыбараў ня ўвязана з пытаньнем праверкі і ажыцьцяўленьня 6-ці ўказаньняў тав. Сталіна.

Аб пераводзе цэхаў на гаспадарчы разрахунак фабрычныя арганізацыі пачынаюць толькі гаварыць. Пераводам-жа брыгад на гаспадарчы разрахунак да гэтага часу ніхто не займаецца.

Адсутнасьць кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам прывяла да развалу ўдарных брыгад.

Значна палепшылися прагулы, за апошні месяц яны складаюць 105 чалавекадзён. Несваячасова забясьпечваецца фабрыка сырцом, у сувязі з гэтым за апошнія 8 месяцаў папяровыя машыны прастаялі 2.796 гадзін.

Сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам ахоплен усяго толькі **41 процант рабочых.** Аднак, і гэтым лічбам самі кіраўнікі фабрыкі ня вераць. Фонд для прэміяваньня лепшых ударнікаў у суме 3.830 рублёў не скарыстаны.

Кіраўніцтва фабрыкай агітуе за выкананьне праграмы і зусім ня цікавіцца выкананьнем якасных паказальнікаў. замест зьніжэньня сабекошту на 13 проц. было ў першым квартале павышэньне на 7,8 проц., а ў 3-м квартале—на 7,9 проц.

Надзвычай дрэнна стаіць справа з падрыхтоўкай кваліфікаваных кадраў. Гуркі па ліквідацыі тэхнічнай няпісьменнасьці распаліся ў выніку адсутнасьці кіраўніцтва з боку партыйных і прафсаюзных арганізацый.

Прапрацоўка ўказаньняў тав. Сталіна на фабрыцы прайшла фармальна. Замест таго, каб у кожнай брыгадзе прапрацаваць і ажыцьцявіць указаньні правадыра партыі, фабрычныя арганізацыі абмежаваліся чыткай прамовы тав. Сталіна на агульна - фабрычным сходзе.

І зараз справаздачна - перавыбарчая кампанія праходзіць бяз удзелу шырокіх рабочых мас. Да гэтага часу яшчэ не прапрацавана адозва УсеЦСПС аб перавыбарах. Ня створана ні аднэй добраахвотнай брыгады для праверкі дзейнасьці фабкому.

ЦК саюзу друкароў і працаўнікоў папяровай прамысловасьці, а таксама гарпрафсавет павінны дапамагчы рабочаму калектыву фабрыкі «Спартак» выбраць працаздольны фабком, які змог-бы забясьпечыць ня толькі выкананьне, але і перавыкананьне прамфінпляну.

Ян.

Кіраўніцтва па тэлефону

На гуце «Ільліч» прарывы ў прамфінпляне ўсё наглыбляюцца. Вытворчая праграма за верасень выканана ўсяго толькі **на 57 проц.** Да гэтага часу не прапрацаваны сярод рабочых 6 ўказаньняў правадыра партыі тав. СТАЛІНА.

Справаздачна - перавыбарчая кампанія заўкому не зрабіла ніякага зруху ў выкананьні прамфінпляну. Кіраўніцтва не займалася пытаньнем арганізаванага набору рабочай сілы. 3-ва адсутнасьці рабочых завод працуе **ў 4 зьмены замест 5.**

Абязьлічанае кіраўніцтва работай з боку дзесятнікаў, безадказнасьць у наглядзе за варывам масы павялічылі брак начыньня да ня бывалых разьмераў.

Несваячасовая падрыхтоўка тары для ўпакоўкі начыньня павялічыла процант бою.

Рацыяналізатарскія прапановы рабочых аб паляпшэньні вытворчасьці адміністрацыяй не праводзяцца ў жыцьцё. Дырэктар рэдка бывае на заводзе. ЁН У БОЛЬШАСЬЦІ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ГОР. БЫХАВЕ І КІРУЕ ЗАВОДАМ ПА ТЭЛЕФОНУ.

Сацыялістычнае спаборніцтва аслабла. Сярод камсамольцаў ёсьць прагульшчыкі і сымуляны. Бюро камсамольскага калектыву разам з усімі арганізацыямі бязьдзейнічае.

Заводзкі клюб працуе толькі ў вялікія рэвалюцыйныя сьвяты, **а наогул увесь час на замку.** Культурна - выхаваўчай работы сярод рабочых ніякай не праводзіцца.

Вось на што неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу ў часе перавыбараў заўкому. Аднак, да гэтага часу яшчэ не прапрацавана адозва УсеЦСПС аб перавыбарах. Ня створаны брыгады для праверкі дзейнасьці заўкому.

Выхаўскім партыйным і прафсаюзным арганізацыям неабходна зацікавіцца заводам. Нягодных работнікаў трэба замяніць лепшымі рабочымі, якія **змогуць вывесьці завод з прарываў.**

А. ТАРАНАЎ.

Кожны дзень—расольнікі і бульбяныя катлеты

Сталоўкі №№ 48 і 69 ня выконваюць дырэктыў партыі аб паблюдным водпуску абедаў, не займаюцца вышуканьнем дадатковых харчовых рэсурсаў

РАЗЬБІЦЬ АПАРТУНІСТЫЧНУЮ ІНЭРТНАСЬЦЬ У АДНОСІНАХ ДА САМАЗАГАТОВАК, ВЫКАРЫСТАЦЬ ВОПЫТ ГОМЕЛЬСКАГА ТСТ

Паблюдная сыстэма па рэцэпту Аўруцінай

У сваёй пастанове аб грамадзкім харчаваньні ЦК КП(б)Б і СНК БССР вызначылі рад канкрэтных мерапрыемстваў, ажыцьцяўленьне якіх павінна самым карэнным чынам палепшыць работу сталовак. У пастанове была падкрэслена неабходнасьць увядзеньня паблюднай сыстэмы водпуску абедаў і праяўленьня ініцыятывы ў вышуканьні мясцовых рэсурсаў. Як-жа праламляюцца гэтыя дырэктывы партыі і ўраду па сталоўках Менску?

Рад фактаў гавораць аб здачынна апартуністычных адносін адміністрацыі раду сталовых і некаторых работнікаў трэсту грамадзкага харчаваньня да справы практычнага праламленьня дырэктыў партыі.

Увядзеньне паблюднай сыстэмы патрабуе праяўленьня ініцыятывы з боку адміністрацыі сталовых у павялічэньні харчовых рэсурсаў за кошт уласных загатовак і адкормачных апэрацый.

Вось гэтага і ня хочуць зразумець многія загадчыкі сталовых. На прапанову аб увядзеньні паблюднай сыстэмы, загадчык сталовак № 37 **Козак** кажа: «Калі мой кухар дасьць згоду, бо ў нас мала кухароў, — тады і я згаджуся і калі да таго-ж нам дадуць усе прадукты, якія толькі нам будуць патрэбны». Аб самазагатоўках ён і слухаць ня хоча — ад яго можна чуць толькі адно: **«Дайце мне — привязеце мне».** Тое-ж адказваюць і загадчыкі 14, 69, 60 і раду іншых сталовак. 11-я сталовая вяўляецца дзяцінскай. Гародніна, пры вялікай колькасьці ў ёй вітамінаў, зьяўляецца важнейшым прадуктам у гэтай сталоўцы. Аднак, з-за нежаданьня загадчыка сталовай паварушыцца, сталоўка ў кастрычніку 15 дзён была без моркавы, у той час, як на базе ЦРК даволі морквы. Таксама **67-я і 69-я сталоўкі.** На тэй-жа прычыне ў кастрычніку на некалькі дзён гатавалі абеды выключна з адных круп. Вельмі мала сталовых, якія што-небудзь зрабілі па забясьпечэньні сябе гародніной на зіму. У справе арганізацыі самазагатовак нічога не зрабіў **і Менскі трэст грамадзкага харчаваньня.** У выніку такіх адносін да самазагатовак і разьліку выключна на цэнтралізаваныя фонды, сталовыя і трэст замест пашырэньня грамадзкага харчаваньня ў лістападзе, ідуць на зьмяншэньне колькасьці абедаў у параўнаньні з кастрычнікам.

Асобныя гора-работнікі з трэсту разважаюць прыкладна так: трэба нам прадуктаў на 60 тысяч абедаў, а ў цэнтралізаваным парадку атрымаем на сорак пяць тысяч. Дык мы і будзем гатаваць сорак пяць тысяч абедаў, а астатніх адмацуем.

Былі спробы пазбавіць права на грамадзкае харчаваньне студэнтаў курсаў прафсаюзу пры ЦСПСБ, курсаў дашкольных работнікаў пры Белпэдтэхнікуме. Загадчык **69-й сталоўкі** не дае прапускоў на абеды тым студэнтам, якія раней харчаваліся ў гэтай сталоўцы, толькі таму, што яны спазьніліся падаць сьпісы да 31 кастрычніка.

Вось малюнак, як разумеюць паблюдную сыстэму водпуску абедаў пасобныя загадчыкі сталовых і некаторыя работнікі менскага трэсту грамадзкага харчаваньня. 1 лістапада ў сталовай **№ 69** паставілі касу і загадалі ўсім студэнтам, у якіх былі абанімэнты стаць у чаргу і абмяняць абанімэнты на абедзенныя талёны, бо сёньня «паблюдная сыстэма», а ў мэню было на першае толькі расольнік, а на другое толькі бульбяныя катлеты. Тое-ж самае было і ў сталоўцы **№ 48.** Такі парадак устаноўлен інструктарам трэсту **Авруцінай.**

Такое скажэньне паблюднай сыстэмы прывяло да таго, што рабочыя і студэнты павінны былі патрацiць шмат часу на стаяньне ў чарзе, каб абмяняць купленыя раней абанімэнты на талёны для атрыманьня абеду бяз выбару.

Трэба ўдарыць па коснасьці і апартунізьме ў арганізацыі грамадзкага харчаваньня. Самазагатоўкі і адкормачныя апэрацыі могуць і павінны даць дадатковыя фонды для павялічэньня колькасьці абедаў і паляпшэньня іх якасьці.

Трэба паказаць загадчыкам сталовак і работнікам трэсту грамадзкага харчаваньня, што паблюдная сыстэма — гэта прадастаўленьне магчымасьці рабочаму выбраць сабе тое, што яму падабаецца, а ня «лопаць тое, што падаюць». А трэба проста сказаць, што гэтага прынцыпу прытрымліваюцца яшчэ многія работнікі сталовак.

Трэба прыцягнуць да актыўнага ўдзелу ў паляпшэньні грамадзкага харчаваньня тых, хто харчуецца ў сталовых. Трэба кожнай сталовай заняцца загатоўкамі гародніны, птушкі і арганізаваць адкормачныя апэрацыі, не чакаючы цэнтралізаванага забясьпячэньня.

Б. В.

Гомельчане паказваюць прыклад перабудовы

Не аслабляць барацьбы за якасьць

Аўтаномная сэкцыя грамадзкага харчаваньня **Гомельскага** раёнага транспартнага камбінату правяла рад практычных мерапрыемстваў па рэалізацыі дырэктыў партыі аб перабудове грамадзкага харчаваньня і паваароце тварам да асеньня-зімовых перавозак.

Сэкцыя поўнасьцю пераведзена на гаспадарчы разрахунак. Колькасьць сталовак і буфэтаў павялічылася з 17 адзінак да 53. Сталовак было ў лютым 7, а цяпер 13. Ларкоў для абслугоўваньня паравозных і зьменных брыгад было 3, а цяпер 8. Замест аднэй хлебапякарні ёсьць дзьве і адна кандытарская.

Колькасьць рабочых, якія абслугоўваюцца грамадзкім харчаваньнем, павялічылася на 210,5 проц. У лютым сталовыя адпусьцілі 286.065 абедаў, а ў верасьні 600.000. Пашырэньне сеткі пацягнула за сабой прыліў новых рабочых, якія цэлымі сем'ямі пераходзяць на харчаваньне сталовак. Гэтым самым хатняя гаспадыні вызваляюцца ад традыцыйнага «прымуса», павялічваюцца кадры новых работнікаў.

Зварот сталовак і буфэтаў павялічыўся са 100.447 руб. у лютым да 228.452 руб. у верасьні. У радзе сталовак уведзен паблюдны водпуск абедаў.

Паравозныя брыгады абслугоўваюцца спэцыяльнай сталоўкай пры дэпо, якая працуе круглыя суткі і адпускае 2.400 блюд гарачай стравы. Апрача таго, у тэрмосах развозяцца абеды: дэпо, грузчыкам і г. д. для пераважнага абслугоўваньня лепшых ударнікаў у сталоўках вызначаны асобныя сталы. Ударнікі атрымліваюць абеды лепшай якасьці і без чаргі з 3-х страў па звычайных цэнах.

Усе прадпрыемствы сэкцыі з мая пераведзены на гаспадарчы разрахунак, а штат па прагрэсыўную зьдзельшчыну, чым дасягнута паляпшэньне абслугоўваньня рабочых. Сэкцыя мае і рад іншых дасягненьняў.

Адкіды сталовак выкарыстоўваюцца для адкорму 30-ці сьвіней. У Гомелі пры кухні-разьмеркавальніку № 1 колькасьць сьвіней павялічваецца да 200 шт. Узьнята пытаньне аб пабудове ў 1932 годзе новых сталовак у Гомелі на 2.000 чалавек, Калінкавічах на 1.000 і Жыткавічах на 500 чалавек. Апрача таго, для абслугоўваньня пасажыраў будуць адкрыты два ларкі на станцыі **Гомель і ў Калінкавічах.**

Але трэба адзначыць, што па якасных паказальніках перабудова грамадзкага харчаваньня праходзіць вельмі марудна. Якасьць абедаў у радзе сталовак не па вышыні. Між тым, ёсьць поўная магчымасьць дабіцца выпуску абедаў больш высокай якасьці. Сталоўкі ў асноўным забясьпечаны прадуктамі. Не ліквідавана антысанітарыя. Сталоўкі адчуваюць недахват у кваліфікаваных кухарох.

Райпрафсаў і газэта «Па сацыялістычных рэйках» не аказваюць сэкцыі практычнай дапамогі. Райпрафсаў абмяжоўваецца толькі рэзалюцыямі. Рабочы кантроль не арганізаваны.

Сэкцыя, замацоўваючы дасягненьні, павінна **няўхільна змагацца за паляпшэньне якасных паказальнікаў.** У гэтым ёй павінны аказаць актыўную дапамогу ўсе мясцовыя, партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі.

Л. Г.

У Менску адкрываецца база „Торгсина"

Прадстаўнік універмагу і базы таварыства «Торгсин», якія адкрываюцца ў Менску ў лістападзе, правёў гутарку з нашым супрацоўнікам. «Торгсин» мае ў сваім распараджэньні вялізарныя фонды экспартных тавараў (прадуктаў, прадметаў шырокага ўжываньня). Адзначыўшы будзе разгорнута работа па паленьнем будзе разгорнута работа па сылачных апэрацыях. Сутнасьць гэтых апэрацый заключаецца ў тым, што замест пасылак на імя грамадзян, якія пражываюць у БССР, з-заграніцы робіцца грашовыя валютныя пераводы на бягучы рахунак «Торгсина», які выдае на суму пераводу пэўныя ўказаныя ў заказе тавары з сваіх фондаў.

Адпраўнік пераводу, які жыве за граніцай, можа ў заказе і не пералічваць намэнклятуры тавараў, прадставіўшы выбар асобе, якой адрасован пераводу.

Пераводы могуць рабіцца з усіх краін сьвету, атрымальнікамі тавараў могуць быць усе, бяз выключэньня, грамадзяне. Сума пераводу таксама не абмяжоўваецца. Намэнклятура тавараў апначаецца ў спэцыяльных прэйс-курантах «Торгсина». Цэны на тавары ўстанаўляюцца зусім даступныя.

Гроші пераводзяцца праз заграничныя банкі і могуць накіроўвацца ў любое аддаленьне «Торгсина», якіх зараз ужо ёсьць да 30 у галоўных пунктах СССР.

Усесаюзны конкурс нізавых газэт калгасаў, саўгасаў і МТС, абвешчаны „Правдой"

МЕНСК, БАРЫСАЎ і ЛЕЗНА ПЕРШЫМІ ЎКЛЮЧЫЛІСЯ Ў КОНКУРС

Ператворым конкурс у масавы рабселькораўскі паход, пад непасрэдным кіраўніцтвам партыйных арганізацый, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за выкананьне плянаў загатовак, за вырашэньне ўсіх асноўных гаспадарча-палітычных задач партыі

РЭДАКЦЫЯМ ГАЗЭТ „ЗЬВЯЗДА" і „РАБСЕЛЬКОР"

Менскі гарком КП(б)В, падаючы выключнае значэньне абвешчанаму «Правдой» конкурсу нізавых газэт калгасаў, саўгасаў і МТС на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, прымае выклік газэты «Зьвязда» і «Рабселькор» і ўключаецца ў правядзеньне конкурсу.

Бюро гаркому ў спэцыяльнай пастанове аб разгортваньні работы па правядзеньні конкурсу намеціла рад канкрэтных мерапрыемстваў. **Склікаецца раённы зьлёт членаў рэдкалегій шматтыражак, насьценных газэт і штодзённак саўгасаў, калгасаў і МТС для распрацоўкі канкрэтных мерапрыемстваў па ўдзеле ў конкурсе.** Адначасова гэта пытаньне будзе спэцыяльна распрацавана на чарговай раённай нарадзе старшынь калгасаў і спэцыялістаў сельскай гаспадаркі.

На вясковых сходах ячэек КП(б)В ставіцца спэцыяльна пытаньне аб практычнай рабоце парт'ячэек па забясьпячэньні партыйнага кіраўніцтва правядзеньнем конкурсу.

Намячаюцца практычныя мерапрыемствы па пераводзе насьценных газэт на пачашчаны выхад, а ў буйных саўгасах і калгасах—на штодзённае выданьне.

Пры буйных калгасах і саўгасах арганізуюцца гурткі па аўладаньні гарантэхнікай. Для кіраўніцтва імі прыцягваюцца спэцыялісты сельскай гаспадаркі. Намячаецца правядзеньне цэлага раду рэйдаў ударных брыгад друку па праверцы выкананьня дырэктыў партыі і ўраду у справе ўвядзеньня зьдзельшчыны, ліквідацыі абязьлічкі і ўраўнілаўкі і ў справе разьмеркаваньня ўраджаю і даходаў у калгасах.

1 лістапада на зьлёце рабкораў гораду Менску абгаворана пытаньне аб уключэньні ў конкурс фабрычна-заводзкага друку і рабкораў, які намецію рад практычных мерапрыемстваў.

Рэдакцыі фабрычна-заводзкіх шматтыражак і насьценных газэт у парадку шэфскай дапамогі рыхтуюць пасылку брыгад і выязных рэдакцый для аказаньня канкрэтнай дапамогі саўгасна-калгасным газэтам у справе разгортваньня конкурсу.

У фабрычна-заводзкіх шматтыражках намечана выданьне абменных палос, прысьвечаных асьвятленьню ходу конкурсу і перадачы вопыту барацьбы фабрычна-заводзкіх партарганізацый і іх органаў друку за выкананьне гаспадарчых плянаў, разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва і выкананьне 6-ці ўказаньняў тав. Сталіна.

Асаблівая ўвага надаецца перадачы вопыту перабудовы работы нізавога друку і рабселькораў згодна пастаноў партыі і 2-га ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў.

Менскі гарком КП(б)В, мабілізуючы ўсю пралетарскую грамадзкасьць і нізавы фабрычна-заводзкі друк гор. Менску, саўгасна-калгасныя масы раёну і сельскі нізавы друк, даб'ецца рашаючых вынікаў у правядзеньні конкурсу і праз нізавы друк фабрык і заводаў дапаможа саўгасна-калгасному нізавому друку і селькорам у іх барацьбе за цэнтральную задачу партыі ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на дадным этапе—арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў.

Культпроп Менгаркому КП(б)Б.

Разгортваем апэрацыйную работу

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону).

Выклік газэт «Зьвязда» і «Рабселькор» прымаем.

Уключаемся ва ўсесаюзны конкурс нізавых газэт саўгасаў, калгасаў і МТС на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Зьвярнуліся са спэцыяльным лістом аб уключэньні ў конкурс па ўсіх шматтыражках, насьценных газэт, штодзённак і рабселькораў. Склалі плян канкрэтных мерапрыемстваў. Адводзім першую спэцыяльную паласу ў газэце.

Фабрычна-заводзкія шматтыражкі пераключыліся на дапамогу нізавому друку падшэфных калгасаў.

Канкрэтны плян высылаем сьпешнай поштай.

Рэдакцыя газэты «Большавік Барысаўшчыны».

Менск, рэдакцыям газэт „Зьвязда" і „Рабселькор"

ЛЕЗНА. Ваш выклік аб уключэньні ў абвешчаны «Правдой» усесаюзны конкурс нізавых газэт саўгасаў, калгасаў і МТС на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў прымаем.

Канкрэтны плян мерапрыемстваў высылаем поштай.

Рэдакцыя «Ленінскага сьцягу»

Садоўскі.

ЗАДАЧЫ І ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕНЬНЯ КОНКУРСУ

Па ініцыятыве раду раённых і абласных газэт і селькораў, якія зьвярнуліся ў «Правду» з прапановамі пачаць кампанію за мабілізацыю селькораў і калгасна-саўгаснага друку на баявое выкананьне чарговых задач калгаснага будаўніцтва, рэдакцыя газэты «Правда» абвяшчае:

УСЕСАЮЗНЫ КОНКУРС НІЗАВЫХ ГАЗЭТ (НАСЬЦЕННЫХ, ПАЛЯВЫХ, ШМАТТЫРАЖАК) У КАЛГАСАХ, САЎГАСАХ І МТС НА ЛЕПШУЮ РАБОТУ ПА АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫМ УМАЦАВАНЬНІ КАЛГАСАЎ

Селькоры і нізавы друк павінны:

а) Арганізоўваць масы на замацаваньня ўсіх навуковых дасягненьняў і вопыту ў справе правядзеньня настаноў партыі і савецкай улады (чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б), VI зьезду Саветаў), аб зьдзельшчыне, аб арганізацыі правільнага ўліку працы кожнага калгасніка па колькасьці і якасьці працаадзён, аб разьмеркаваньні даходаў па колькасьці і якасьці выпрацаваных працадзён.

Весьці рашучую барацьбу з правааапартуністычнымі кулацкімі імкненьнямі зьнішаць нормы выпрацоўкі, перашкодзіць разьбіцьцю сустрэчных норм, сарваць зьдзельшчыну і выразную арганізацыю працы і г. д.

Таксама весьці бязьлітаснае выкрываньне новых маноўраў кулака і агентуры кулацтва—апартуністаў, якія прапагандуюць і праводзяць дробна-буржуазную «лявацкую» ўраўнілаўку ў разьмеркаваньні даходаў, у выдачы натуральных авансаў, у прэміяваньні і г. д.

б) Дабіцца зьнішчэньня ўсіх недахопаў у арганізацыі працы калгасьнікаў, замацаваць зьдзельшчыну (брыгадную і індывідуальную) ліквідаваць абязьлічку ў працы, дапамагчы правільна расставіць сілы па вучастках, брыгадах і інш. Бязьлітасна выкрываць кулацкую прапаганду абязьлічкі, як спробу дэзарганізаваць вытворчасьць у калгасах. Стаць пад кіраўніцтвам партыі арганізатарам сацспаборніцтва і ўдарніцтва, сустрэчных плянаў, робячы нізавыя газэты баявымі арганізатарамі сацыялістычных форм працы.

в) У тэрміны, якія засталіся, у адпаведнасьці з мясцовымі ўмовамі ўжыць усе меры да поўнага выкананьня пляну па зяблеве (нагнаць упушчанае, павысіць нормы выпрацоўкі, перавыканаць пляны, засвоіць новыя вучасткі цаліны).

г) У найкарацейшы тэрмін дабіцца выкананьня і перавыкананьня плянаў збожжазагатовак, а таксама хутчэйшага выкананьня плянаў загатовак тэхнічных культур, арганізуючы масы калгасьнікаў на высоўваньне сустрэчных плянаў, арганізацыю чырвоных абозаў, вывазку збожжа з глыбінных пунктаў і г. д. Арганізаваць селькораў на поўнае выкананьне плянаў загатовак у аднаасобным сэктары, на барацьбу з утойваньнем збожжа кулакамі і кулацкімі агентамі.

Павесьці рашучую барацьбу з праяўленьнямі дробна-буржуазнай стыхіі, з кулацкімі спажывецкімі тэндэнцыямі ў паасобных калгасах, буржуазнымі тэндэнцыямі паасобных кіраўнікоў калгасаў і саўгасаў у адносінах да пралетарскай дзяржавы (стварэньнем кармовых, страхавых і інш. фондаў за кошт загатовак, за кошт закантрактаванага збожжа і г. д.).

д) Шырока папулярызаваць дырэктывы партыі і ўраду аб адыхсдніцтве, максымальна спрыяючы выкананьню пляну адыходніцтва, высоўваючы кадры адыходнікаў, растлумачваючы масам усё значэньне новых форм забясьпячэньня сацыялістычнай прамысловасьці рабочай сілай. Змагацца за максымальнае ўпчыньленьне рабочага дня ў калгасах, за рацыяналізацыю працы, гэтым самым дабіваючыся вылучэньня лішняй рабочай сілы ў прамысловасьць і ў саўгасы.

е) Прыняць актыўны ўдзел у складаньні новых с.-г. плянаў на 1932 год, імкнучыся да таго, каб уся маса калгасьнікаў праявіла максымальную ініцыятыву ў барацьбе за высокі ўраджай, за севазварот, у барацьбе з засухай на аснове аўладаньня агратэхнікай.

ж) Садзейнічаць партарганізацыям у разгортваньні марксыцка-ленінскай вучобы сярод мас калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і МТС, дабіваючыся таго, каб аўладаньне імі марксыцка-ленінскім сьветапоглядам злучалася з усёй іх штодзённай практыкай на выкананьні і перавыкананьні вытворчых плянаў, каб яно дапамагала росту і ўмацаваньню калгасаў.

Апрача гэтых задач, **селькоры і нізавы друк жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных фэрм павінны:**

а) Папулярызаваць сярод шырокіх мас адозву ЦК УсеКП(б) і СНК аб жывёлагадоўлі.

б) Забясьпечыць правядзеньне ўказаньняў тав. Сталіна аб ліквідацыі ўраўнілаўкі, правядзеньні гаспадарчага разрахунку. Дабіцца на справе адказнасьці кожнага калгасьніка ў справе догляду жывёлы, паляпшэньня галоўні скаціны, забясьпячэньня кармавой базы (поўнае выкананьне пляну сілаваньня), падрыхтоўкі скаціны да зімоўкі і г. д.

в) Дабіцца ўзмацненьня выхаду таварнай прадукцыі, павышэньня ўдойнасьці кароў і г. д.

Рабкоры і нізавы друк саўгасаў павінны разгарнуць барацьбу за ўмацаваньне саўгаснага будаўніцтва на аснове правядзеньня 6-ці ўмоў тав. Сталіна, а таксама шырэй асьвятляць пытаньні калгаснага будаўніцтва, арганізуючы масы рабочых саўгасаў для дапамогі арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў.

Рабкоры і нізавы друк МТС павінны дапамагаць апошнім умацоўваць іх вядучую ролю ў арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў.

Рабкоры і нізавы друк заводаў, фабрык, устаноў уключацца ў конкурс па лініі шэфскай дапамогі калгасным газэтам (перадаць вопыт арганізацыйна-вытворчай работы прадпрыемстваў, лепшыя формы і мэтады ўдарніцтва ў друку і масавай работы заводзкіх газэт). Друк каапэрацыі выступае ў конкурсе за лепшую арганізацыю снабжэньня, за разгортваньне масавага рабселькораўскага руху ў органах каапэрацыі (сельспажы

ПРАЛЕТАРСКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ НЯМЕЦКАЙ РАБОЧАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ,

якая прыяжджае на Кастрычніцкія сьвяты

Год выданьня—XV
№ 301 (4287)
Серада, 4 лістапада
Цана нумара 5 кап.
выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьвязда

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны
рэдактар—4-27,)—сакратар—10-74, парт.сакратар—13-80, прамысл.—13-80, сав. земл.—6-19, мясц.інфарм.—6-17, замеж. інфарм.—6-19, нічны рэдактар—6-42, мінск родзкі інфарм.—10-74, канторавыд-ва—7-81, адд. абвестак—7-31

Японія адмовілася
эвакуяваць Манчжурыю

У МАНЧЖУРЫЮ ПАСЫЛАЮЦЦА НОВЫЯ ВОЙСКІ

Ліга Нацый адкрыта салідарызуецца з Японіяй

„Спачатку перагаворы аб асноўных прынцыпах"

ТОКІЁ, 3. Кітайскі пасланьнік у Японіі Чжан Цзо-пін у ноце японскаму ўраду паведамляе аб незачэпленьні кітайскіх прадстаўнікоў для «прыняцьця розных раёнаў трох усходніх правінцый (Манчжурыі) пасьля эвакуацыі японскіх войск, згодна пастановы Лігі Нацый ад 24 кастр. чніка».

Чжан Цзо-пін паведамляе таксама, што нанкінскі ўрад гатоў да перагавораў аб «дэталях» эвакуацыі і перадачы накіданых мясцовасьцяй і «спадзяецца, што японскі ўрад, на працягу часу, назначыць прадстаўнікоў для ўдзелу ў перагаворах». Нота датавана 27-га кастрычніка.

Адказ Сідэхара, які публікуецца сёньня разам з нотай Чжан Цзо-піна, пачынаецца ўказаньнем: «24 кастрычніка Ліга Нацый ня прымала падобнай рэзалюцыі, якая прыведзена ў ноце Чжан Цзо-піна». Што датычыць эвакуацыі і перадачы мясцовасьцяй, дык пункт гледжаньня японскага ўраду — гаворыцца ў адказе—выказан у папярэдняй ноце Сідэхара (аб «гарантыі бясьпечнасьці» і заключэньні дагавораў), а таксама ў папярэдняй дэкларацыі ад 26-га кастрычніка. «Таму, — кажзавае Сідэхара,—японскі ўрад спадзяецца, што кітайскі ўрад згодзіцца з японскім пунктам гледжаньня, у выпадку чаго хутка могуць распачацца перагаворы аб асноўных прынцыпах, якія рэгулююць адносіны паміж дзьвюма краінамі, а таксама і па пытаньні аб эвакуацыі».

Выразная расшыфроўка палітыкі Лігі Нацый

ТОКІЁ, 2. Прадстаўнік Японскага міністэрства замежных спраў у Жэнэве Сугімура паведаміў аб заяве Брыяна, што адказ на пяць пунктаў японскіх патрабаваньняў пераданы ўсім членам савету Лігі Нацый. Іасізава патрабаваў затрымаць апублікаваньне адказу Брыяна да распрацоўкі адказу Японіі.

Далей Сугімура паведаміў, што Рэйхман (член камісіі Лігі Нацый па ахове здароўя ў Кітаі, які знаходзіцца ў Нанкіне, паведаміў Дрэмонда (сакратар Лігі Нацый), што нанкінскі ўрад рыхтуючыся да падтрыманьня парадку ў Манчжурыі пасьля эвакуацыі японскіх войск, канцэнтрує свае войскі ў раёне Цзіньчжоу.

Адкрытае прызнаньне Сідэхары

ТОКІЁ, 2. Паводле паведамленьня агенцтва Дэмпо Цусін, вайсковы міністар Мінамі ў радзе міністраў заявіў: «перадаю, што брытанскія ўлады адкрыта аказваюць падтрыманьне Чан Кай-шы. Далей Мінамі ўказаў, што рас пускаюцца рознастайныя чуткі аб назьцыі Фын Юй-сяна і Ен Сі-шаня. Адны сьцьвярджаюць, што Фын Юй-сян і Ен Сі-шань рыхтуюцца выступіць супроць Чжан Сюэ-ляна, другія гэта абвяргаюць. Відавочна адно, а іменна, што Ен Сі-шань дагаварыўся з кантонцамі.

Закранаючы становішча ў Манчжурыі, Мінамі сказаў, што ў Манчжурыі па сутнасьці ніякіх зьмен няма.

Міністар замежных спраў Сідэхара паведаміў, што «грамадзкая думка Англіі і Францыі зусім не настроена супроць Японіі».

Лін Ін-чэн захоплен Чжан Сэю-лянам

ТОКІЁ, 3. Па паведамленьні «Сімбун Рэнго» з Мукдэну, Лін Ін-чэн (японскі стаўленік, кіраўнік руху за «незалежнасьць» Манчжурыі) захоплен са сваім штабам войскамі Чжан Сэю-ляна ў раёне Паншаня (на Бэйпін-Мукдэнскай чыгунцы).

Адпраўка новых войск ў Манчжурыю

ТОКІЁ, 2. Японская газэта «Комукін» ад 31 кастрычніка паведамляе, што чыгуначны полк, які знаходзіцца ў гор. Ціба (галоўны горад аднаіменнай правінцыі ля Токіё), атрымаў загад аб мабілізацыі. У якасьці першай групы, якая накіроўваецца ў Манчжурыю, сёньня выяжджае паручык Гота з трыма унтэр-афіцэрамі і 6 салдатамі. Другая і трэцяя групы выяжджаюць у Манчжурыю гэтымі днямі і будуць знаходзіцца ў розных чыгуначных пунктах Манчжурыі.

Наступленьне на Цзінчжоу

ТОКІЁ, 2. Паводле паведамленьня агенцтва Сімбун Рэнго з Мукдэну, войскі Лін Ін-чына (японскі стаўленік, кіраўнік руху за «незалежнасьць» Манчжурыі) пачаў бай з цзінчжоўскімі войскамі. Увечары 31 кастрычніка ў раёне станцыі Паншань (на Бэйпін-Мукдэнскай чыгунцы) працягваліся баі. Становішча ў Цзінчжоу пахіснулася, з прычыны пераходу ў лягер Лін Ін-піна раду былых прыхільнікаў Чжан Сюэ-ляна ў Паншане, Камапці і іншых мяжох уздоўж Бэйпін-Мукдэнскай чыгункі. Перадаюць, што войскі Лін Ін-чына гэтымі днямі атрымалі два самалёты.

Прысяга гаспадару

МУКДЭН, 1. Як паведамляюць, члены «камітэту паўночна-ўсходніх дарог» 29 кастрычніка прынялі прысягу. Камітэт нядаўна створан у Мукдэне з японскіх стаўленікаў. Задача камітэту: «кантраляваць чыгуначную адміністрацыю 4-х усходніх правінцый».

Чарговыя ноты

ТОКІЁ, 2. Чан Кай-шы зьвярнуўся з нотай да японскага ўраду, у якой патрабуе эвакуацыі войск з Манчжурыі. Міністэрства замежных спраў катэгарычна адхіліла ноту.

ТОКІЁ, 2. Паводле паведамленьня агенцтва Сімбун Рэнго з Нанкіну, нанкінскі ўрад паведаміў Японію аб назначэньні Вэлінгтона Ку, Чжан Цзо-сяна і інш. для прыёмкі «эвакуяваных мясцовасьцяй».

Узмацненьне пазыцый абаронцаў Цыцыкара

ТОКІЁ, 2. Сімбун Рэнго з Харбіну паведамляе, што з прыбыцьцём у Цыцыкар 26-й брыгады гірынскіх войск з трыма бронепягнікамі пазыцыя генэрала Ма ўзмацнілася.

Ма ня даў пэўнага адказу на японскі ультыматум у адносінах аднаўленьня мосту праз раку Ноні і мае намер перарваць да доўгі тэрмін рух па Таонань-Цыцыкарскай чыгунцы.

Пачалася забастоўка
ГАМБУРСКІХ ПАРТОВЫХ РАБОЧЫХ

МНОГІЯ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНЫЯ РАБОЧЫЯ БАСТУЮЦЬ РАЗАМ З РЭВАЛЮЦЫЙНЫМІ ПАРТАВІКАМІ

ГАМБУРГ, 2. Сёньня пачалася частковая забастоўка гамбурскіх партовых рабочых.

Учора на сходзе партавікоў, на якім абмяркоўвалася рашэньне трацейскага суда аб скарачэньні зарплаты, была прынята пастанова зьвярнуцца да ўсіх партовых рабочых з заклікам абвясьціць, згодна рашэньня 85 процантаў усіх партовых рабочых, усеагульную забастоўку.

Адначасова рэфармісты апублікавалі штрэйкбрэхэрскую адозву да партавікоў. На біржы працы бесспрацоўныя партовыя рабочыя не зьяўляюцца з-за салідарнасьці да забаставаўшых партавікоў. Рабочыя буйных транспартных фірм «Лёўдынг», «Нільсэн» і інш. сёньня ня выйшлі на работу. **Многія сацыял-дэмакратычныя рабочыя — члены рэфармісцкага саюзу бастуюць разам з рэвалюцыйнымі партавікамі.** У гавані ўсхваляваныя партавікі абмяркоўваюць здраду рэфармісцкіх прафбюракратаў і выказваюцца за забастоўку, адхіляючы ўсякія перагаворы з прадпрыемцамі. Штрэйкбрэхэрскія лістоўкі рэфармісцкіх прафбюракратаў з абурэньнем разьдзіраюцца і тых, хто распаўсюджвае гэтыя лістоўкі, партовыя рабочыя праганяюць з гавані. На біржах працы ў Гафэнтоне і Штубэнхуку ў сувязі з забастоўкай была прыпынена насыпка пар тавікоў на работы. Частка рабочых буйнога пароходнага таварыства «Гамбургзюд» далучылася да бастуючых.

Прыезд нямецкай рабочай дэлегацыі

Сёньня ўвечары ў Менск на Кастрычніцкія сьвяты прыяжджае нямецкая рабочая дэлэгацыя. Для сустрэчы дэлэгацыі ў Нэгарэлае выяджаюць прадстаўнікі прафарганізацый і Менскіх заводаў

Т. т. Сталін і Молатаў—будаўнікам аўтазаводу

МАСКВА, 3. Ніжні-Ноўгарад, аўтазавод Тыбецу, Царэскаму, Кузьнэцову:

«Гарачае прывітаньне рабочым і адміністрацыйна-тэхнічнаму пэрсаналу будоўлі ў сувязі з пасьпяховым скончэньнем будаўнічых работ заводу.

З перамогай, таварышы! Жадзем вам далейшых посьпехаў у справе мантажу, наладжаньня і пуску завода-гіганта. Не сумняваемся, што зможаце перамагчы ўсе труднасьці і з гонарам выканаеце свой абавязак перад краінай.

І. СТАЛІН, В. МОЛАТАЎ».

10.000 кітайскіх гарнякоў спыніла працу

ШАНХАЙ, 2. Паводле паведамленьня кітайскіх газэт, на Кайлянскіх капальнях забаставала звыш 10.000 рабочых. Забастоўка выклікана забойствам кітайскага гарняка ангельцам — служачым адміністрацыі Кайлянскай кампаніі. Кайлянскія вугольныя капальні знаходзяцца ў правінцыі Хобэй (Чжылі) і кантралююцца ангельскім капіталам. У капальнях занята звыш 22.000 рабочых.

Мабілізацыя сродкаў

ПЕРАТВОРЫМ АШЧАДКАСЫ
ў баявыя органы сацыялістычнага накапленьня

Апарат ашчадкас яшчэ не адмовіўся ад ролі простага фіксатара ўкладаў, ня стаў яшчэ сапраўдным арганізатарам ашчадсправы

Баявымі тэмпамі фінэстафэты выканаць плян ашчадкас на 4 квартал

На апошнім пасяджэньні Калегіі Наркамфіну быў заслухан даклад аб рабоце кіраўніцтва ашчадкас і выкананьні дырэктыў па ўзмацненьні ашчадсправы ў БССР.

Калегія прызнала, што сыстэма ашчадкас БССР на працягу 1931 году дапа павялічэньне ўкладаў звыш чым на 2 млн. руб. На 1 кастрычніка астача ўкладаў дасягае 21. млн. р. у тым ліку фізычных укладаў 14.500 т. Значна павялічылася клієнтура ашчадкас. Лік укладчыкаў дасягае 600 тысяч ч. Сетка ашчадкас на 1 кастрычніка складае 1.548 кас, з іх 1.104 — на вёсцы.

Побач з гэтым Калегія НКФ канстатуе рад сур'ёзных прарываў у рабоце ашчадкас.

Заданьне па фізычных укладах на 1 кастрычніка выканана толькі на 31%, прычым у трэцім квартале прыліў укладаў складае толькі 12,8%, квартальнага заданьня. Заданьне па рэалізацыі пазыкі «Трэці рашаючы» выканана на 94,2%. Асабліва дрэнна выканана заданьне па адналасобным сэктары — 29,4%. Значнае адставаньне ёсьць таксама і па лініі афармленьня пазыкі. На 1 кастрычніка па групе рабочых і служачых аформлена ўзносамі 92,6%, падпіскі па калгасах — 51,2%.

Нездавальняючыя вынікі ёсьць і па іншых галінах работы ашчадкас. Так, плян асабістага страхаваньня (паводле вестак з 72 раёнаў) выканан усяго на 55%, слаба разьвіваюцца безнаяўныя разьлікі па масавых плацяжох насельніцтва.

Пры слабым ажыцьцяўленьні пляну пашырэньні сеткі ашчадкас (50,6%) амаль палова адкрытых ашчадкас зьяўляюцца касамі ніжэйшага тыпу. Касавым абслугоўваньнем ахоплена ўсяго 150 бісджэтаў сельсаветаў.

Вынікам прарываў у выкананьні заданьняў ашчадкас зьяўляецца ВЕЛЬМІ ВЫСОКІ КОШТ АПЭРАЦЫЙ І АПАРАТУ.

Першыя дзьве дэкады кастрычніка ніякага пералому ў галіне ўзмацненьня укладаў у ашчадкасы ня далі, а наадварот, ёсьць адліў, які перавышае 80.000 руб.

Асноўныя прычыны прарыву — слабасьць ашчадкага апарату і яго асноўнага зьвяна — райашчадкас, якія яшчэ ня сталі ў большасьці раёнаў арганізатарамі ашчадсправы і дзяржкрэдыту.

Становішча з кадрамі ў сыстэме ашчадкас зусім нездавальняючае. Значная частка загадчыкаў ашчадкас не адпавядае свайму прызначэньню. Інспэктарскі склад у большасьці ня мае вопыту і належнай падрыхтоўкі. У 8-мі райкасах зусім няма бухгальтароў. Амаль у палове раённаў бухгальтары падлягаюць замене.

Сыстэматычная масавая работа па ашчадсправе не праводзіцца, ня ўвязваецца з агульнай культмасавай работай, сярод насельніцтва гораду і вёскі.

Ашчадкасы НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА АБСЛУГОЎВАЮЦЬ працоўныя масы ўкладчыкаў, несвячасова выконваюць даручэньні клієнтуры; ёсьць факты бюракратызму і цяганіны ў паасобных касах.

Калегія Наркамфіну адзначыла таксама рад недахопаў у рабоце кіраўніцтва ашчадкас. Адсутнічае дыфэрэнцыяванае кіраўніцтва раёнамі і вучотам. Не нападжан нагляд за выкананьнем на мясцох дырэктыў партыйных і савецкіх органаў.

Для рашучай перабудовы і актывізацыі работы ашчадкас, Калегія Наркамфіну прапанавала кіраўніцтву ашчадкасамі прыняць самыя рашучыя меры да ўзмацненьня і паляпшэньня работы ўсёй сыстэмы і ліквідацыі прарываў у месячны тэрмін.

Прапанавана палепшыць кіраўніцтва раёнамі і ў двухдэкадны тэрмін перайсьці на сыстэму дыфэрэнцыяванага кіраўніцтва парыфэрыяй.

Жывая сувязь і інструктаж раёнаў павінны быць узмоцнены.

НКФ прапанаваў рашуча ўзмацніць агітмасавую работу па ашчадсправе ўстанавіўшы штодзённую сувязь з прафсаюзнымі, камсамольскімі і грамадзкімі арганізацыямі.

Кіраўніцтву ашчадкасамі, загадчыкам райфа і райашчадкас даручана ўжыць рашучыя меры да паляпшэньня абслугоўваньня ўкладчыкаў і пазыкатрымацеляў.

Да 1 студзеня 1932 году ў кожным раёне і буйных гарадзкіх цэнтрах павінны быць АРГАНІЗАВАНЫ ПАКАЗАЛЬНЫЯ КАСЫ З ПРЫКЛАДНАЙ ПАСТАНОЎКАЙ РАБОТЫ І АБСЛУГОЎВАНЬНЯ ПРАЦОЎНЫХ.

У дэкадны тэрмін трэба дабіцца выкананьня пляну разгортваньня сеткі за 1931 год. Неабходна ахапіць сэзонных рабочых, лесараспрацовак, сплаву і г. д. шляхам адкрыцьця ашчадкас на буйных сэзонных работах.

На працягу IV кварталу трэба арганізаваць ня менш 10 ПАКАЗАЛЬНЫХ АШЧАДКАС У БУЙНЫХ КАЛГАСАХ.

Не пазьнаей 1 студзеня 1932 году гарадзкія і раённыя ашчадкасы павінны быць пераведзены на САПРАЎДНЫ ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК.

Для паляпшэньня матар'яльных умоў работнікаў ашчадкас і барацьбы з цяганінай, Калегія НКФ прызнала неабходным павысіць існуючыя стаўкі работнікаў.

Аб'яднаны рэйд брыгад „Зьвязды" і ЦП ФБР

Ашчадсправа—на задворках
РАБОТЫ МЯСЦКОМАЎ І КАМІСІЙ САДЗЕЙНАСЬЦІ

Плян мабілізацыі сродкаў праз уклады ў ашчадкасы за 3 квартал выканан толькі на 12,8 проц. Ашчадкасы да гэтага часу яшчэ не перабудавалі сваёй работы для лепшага абслугоўваньня ўкладчыкаў. Чаргі, цяганіна ў абслугоўваньні ўкладчыка наглядаюцца амаль ва ўсіх касах.

Але побач з гэтым трэба адзначыць зусім недапушчальныя адносіны раду нашых устаноў, і асабліва камісій садзейнасьці дзяржкрэдыту да пытаньня мабілізацыі шырокіх мас вакол ашчадсправы.

Рэдакцыя «Зьвязды» і ЦП фінбанкаўскіх работнікаў арганізавалі рэйд ударных брыгад, якія абсьледвалі работу камісій садзейнасьці, мясцкомаў Дзяржбанку, Наркамфіну, Наркамснабу і ВСНГ.

Рэйд выявіў недапушчальныя адносіны з боку камісій садзейнасьці, адміністрацыі ўстаноў і мясцкомаў да гэтай важнейшай справы.

У Дзяржбанку „нічога ня вядаюць

Старшыня мясцкому **Дзяржбанку** тав. **Філіповіч**, да якога брыгада зьвярнулася з запытаньнем — што робіцца для ўзмацненьня ашчадсправы, — нічога ня мог адказаць, бо мясцком гэтым пытаньнем не займаўся.

Намесьнік старшыні камісіі садзейнасьці пры Дзяржбанку сустрэў брыгаду наступнымі словамі: «Што гэта кожны месяц брыгады ходзяць — а працаваць не даюць». Тут-жа яна (намесьнік) вымушана была прызнаць, што камісія садзейнасьці ніякай работы не праводзіць.

Як гэта ня дзіўна, але трэба прызнаць, што ў Дзяржбанку камісіі садзейнасьці і грамадзкіх інструктароў фактычна ня існуе.

Ня гледзячы на тое, што ў будынку Дзяржбанку ёсьць ашчадная каса, пэнсія праз агошнюю ня выплачваецца.

У НКФ і НКСнабе ашчадсправай ня цікавяцца

Калектыў Наркамфіну, які павінен быў паказаць прыклад узорнай мабілізацыі сродкаў, ашчадсправай не займаецца. Камісія садзейнасьці НКФ гэтым пытаньнем ня цікавіцца.

Ня лепш стаіць справа і ў **Наркамснабе.** Работа па ўцягненьні новых укладчыкаў не праводзіцца. Грамадзкія інструктары ня вылучаны. Камісія садзейнасьці ня лічыць работу па ашчадсправе сваім абавязкам. Супрацоўнік Наркамснабу тав. **Буртыс** паведаў, што ён вылучан старшынёй камісіі садзейнасьці.

Мясцком Наркамснабу пытаньнем мабілізацыі сродкаў зусім ня цікавіцца. Намесьнік старшыні мясцкому т. **Фурэмс** заявіў: «у нас, здаецца, ёсьць камісія садзейнасьці, але як яна працуе, ня ведаю».

Трэба адзначыць, што да ліпеня ў Наркамснабе пэнсія выдавалася праз ашчадкасу. У канцы ліпеня загадчык гарашчадкасы тав. **Каваль** распарадзіўся спыніць перавод грошай у ашчадкасу з прычыны «адсутнасьці эфэктыўнасьці» (?!)

У выніку вольныя сродкі працаўнікоў Наркамснабу замест ашчадкасы ляжаць у кішэнях без усялякай карысьці для дзяржавы.

У ВСНГ працуюць па-баязому

Зусім іншы малюнак у ВСНГ. Мясцком на спэцыяльным сходзе супрацоўнікаў абгаварыў пытаньне аб узмацненьні ашчадсправы. Мясцком вылучыў спэцыяльнага таварыша, які адказвае за сувязь калектыву супрацоўнікоў з ашчадкасай. Наладжан улік укладчыкаў. Усе работнікі ВСНГ зьяўляюцца ўкладчыкамі і ашчадкасы.

Камісія садзейнасьці працуе пад непасрэдным кіраўніцтвам партканкалектыву і мясцкому.

Камісіі садзейнасьці прадпрыемстваў і устаноў павінны дабіцца рашучага пералому ў выкананьні плянаў мабілізацыі сродкаў праз ашчадкасы. Лёзунг «ні адзнаго працоўнага без ашчадкніжкі» павінен быць ажыцьцёўлен.

Брыгада «Зьвязды»: **Раманоўскі, Нікіцін, Кац, Сноўскі, Шляхтуноў.**

Палепшыць абслугоўваньне пазыкатрымальнікаў

з 1 па 15 лістапада—пятнаццатідзёньнік праверкі аблігацый

Замацаваньне посьпеху рэалізацыі пазыкі імя «3 рашаючага» і далейшае прыцягненьне сродкаў насельніцтва праз дзяржаўныя пазыкі ставяць перад фінансава-крэдытным апаратам патрабаваньне — рашучага паляпшэньня абслугоўваньня шматмільённай масы пазыкатрымацеляў гораду і вёскі.

Работнікі ашчадкага апарату і банку часта недаацэньваюць значэньня належнага абслугоўваньня пазыкатрымацеляў. Так, Магілёўская райашчадкаса лічыць непатрэбным праверыць пасьля тыражоў аблігацыі, якія знаходзяцца на хаваньні ў ашчадкасе. Пазыкатрымацель не інфармуецца аб тым, што на яго аблігацыю прыпаў выйгрыш. Такіх фактаў ёсьць шмат. У выніку такіх адносін па Саюзе ня выплачана выйгрышаў на суму звыш **60 млн. руб.**

Выдача гэтай сумы пазыкатрымацелям паслужыла-б рэальнай агітацыяй за набыцьцё дзяржаўных пазык.

З 1-га па 15 лістапада па ўсім Саюзе, а таксама і на БССР праводзіцца кампанія **паляпшэньня абслугоўваньня пазыкатрымацеляў,** дасканалай праверкі аблігацый ўсіх масавых пазык, пасьля чаго пазыкатрымацелі будуць паведамлены аб выйгрышах.

За правядзеньне гэтай работы адказваюць фінансава-крэдытныя апараты, асабліва ашчадныя касы.

Тыражы пазыкі імя «3-га рашаючага» будуць праводзіцца штомесячна. Фінансава-крэдытны апарат павінен перабудаваць сваю работу каб праверка праводзілася сыстэматычна.

Да праверкі масавых пазык павінна быць прыцягнута ўся грамадзкасьць. Асабліва вялікую голю ў гэтай справе павінны адыграць камісіі дзяржкрэдыту і грамадзкія інструктары.

Апарата непасрэднага ўдзелу ў праверцы аблігацый, камісіі садзейнасьці павінны сыстэматычна абсьледваць работу апарату ашчадкасы і банку ў адносінах выкананьня даных дырэктыў.

ЦП саюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў павінна ўзяць гэту справу пад сваё кіраўніцтва, мабілізаваўшы ўвесь прафактыў і ўсіх супрацоўнікаў фінансава-банкаўскага апарату. Неабходна разгарнуць сацспаборніцтва, забясьпечыць ўдарную работу па абслугоўваньні пазыкатрымацеляў.

На вёсцы гэты вучастак работы зьяўляецца зусім закінутым. Сялянства ня ведае аб тыражох, да выйгрышаў часта адносяцца з недавер'ем, у зьвязку з чым пазыка на вёсцы распаўсюджваецца вельмі марудна.

Задача фінансава-крэдытных органаў, камісій садзейнасьці, грамадзкіх інструктароў і ўсёй грамадзкасьці — арганізаваць масавую праверку аблігацый на вёсцы, дабіцца выдачы выйгрышаў на агульных сходах сялян.

Вольпава.

Заводы рапартуюць аб перамогах

Рапарт „Камунара"

ЗА ЧАС ФІНЭСТАФЭТЫ НА ЗАВОДЗЕ «КАМУНАР» ДАДАТКОВАЯ ПАДПІСКА НА ПАЗЫКУ ІМЯ «ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА» ДАЛА 5.000 РУБ. КАЛЕКТЫЎНЫМ СТРАХАВАНЬНЕМ АХОПЛЕНА 86 ПРОЦ. УСІХ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ ЗАВОДУ.

ПА ЎСІХ ЦЭХАХ ПРАВЕДЗЕНА ПАДПІСКА НА ПЕРАЛІЧЭНЬНЕ ЗАРПЛАТЫ Ў АШЧАДКАСУ. ПАДПІСКАЯ АХОПЛЕНА 476 ЧАЛАВЕК НА СУМУ 5.554 РУБ.

У ДАЛЕЙШЫМ ДАБІВАЕМСЯ 100 ПРОЦ АХОПУ РАБОЧЫХ ПАЗЫКАЙ, УКЛАДАМІ Ў АШЧАДКАСУ І КАЛЕКТЫЎНЫМ СТРАХАВАНЬНЕМ.

Сакратар партканкалектыву заводу «Камунар» ГОБЭРМАН; старшыня заўкому СЬЛЁЗБЭРГ; сакратар камсамольскага калектыву ЭНГЕЛЬСОН; загадчык прыпісной ашчадкасы ВОЛГІН.

300 новых укладчыкаў

ФАБРЫКА «КАМУНАРКА» ЗА ЧАС ФІНЭСТАФЭТЫ ДАБІЛАСЯ ЗНАЧНЫХ ДАСЯГНЕНЬНЯЎ НА ФІНАНСАВЫМ ФРОНЦЕ. НА ПАЗЫКУ «ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ» ПАДПІСАЛАСЯ 155 НОВЫХ РАБОЧЫХ НА СУМУ 12.000 РУБ. ПАДПІСКА ПОЎНАСЬЦЮ АФОРМЛЕНА.

ЗА КАСТРЫЧНІК ЗАВЕРБАВАНА 300 НОВЫХ УКЛАДЧЫКАЎ У АШЧАДКАСЫ, НА СУМУ 3.200 РУБ., ШТО СКЛАДАЕ 65 ПРОЦ. КВАРТАЛЬНАГА ЗАДАНЬНЯ. КАЛЕКТЫЎНЫМ СТРАХАВАНЬНЕМ АХОПЛЕНА 285 ЧАЛАВЕК.

ПАЧАТА РАБОТА ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ФОТААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ. ДА 14-АГА ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА ПАСТАНОЎЛЕНА ДАБІЦЦА СТОПРОЦАНТНАГА АХОПУ РАБОЧЫХ ПАЗЫКАЙ І АШЧАДКАСАЙ.

Сакратар партканкалектыву **КАПЯЛЕВІЧ**; старшыня фабкому **ГАЙТЛЕР**; сакратар камсамольскага калектыву **ГУРВІЧ**; пам. старшыні камісіі садзейнасьці **ДОРСКАЯ.**

Сіроцінская буксірная брыгада разгарнула работу

РАСОНЫ. (Па тэлеграфу).

Раён 28 кастрычніка ўключыўся ў фінэстафэту. РВК мабілізаваў 35 товарышоў для пасылкі іх у сельсаветы. Буксірная брыгада дабілася значнага пералому ў выкананьні фінпляну. Месячны плян выканан на 63,3 проц. супраць 29 проц. на 20 кастрычніка

Сельсаветы ўключыліся ў фінэстафэту. Заключаны сацумовы па лепшаму выкананьню фінпляну.

Буксірная брыгада Сіроцінцаў.

Паведамленьні

— 4 лістапада, у 6 гадз. веч., у памяшк. аб'яднанага бюро скарбаў ЦКК-НК РСІ БССР (Савецкая, 55, 1-ы паверх) адбудзецца пасяджэньне аб'яднанага бюро скарбаў з разглядам наступных спраў: 1) Справа Ясінскага аб зьнясьцьці з працы. 2) Справа Хоціна Абр. аб зьнясьцьці з працы. 3) Справа Белкалгасцэнтру. 4) Справа НКПраны. 5) Справа настаўніцы Пінус. 6) Справа Хмельніка. 7) Справа Лур'е. 8) Справа Маркевіча. 9) Справа Сабалеўскага аб індывідуальным абкладаньні. Усе т. т., якіх гэтыя справы датычаць, павінны зьявіцца. Выклікаюцца рабочыя засядацелі: Дроад, Канаровіч, Мехейка, Астрайка, Грыб (малы рамонт вагонаў (МРВ)—пасажырская станцыя), Шутзін, Макоўшчык, Камароўская, Цэгле, Дайноўскі (лямцавая ф-ка), Пятрушкін, Валынец, Катан (шчацінная ф-ка). Запрашаецца актыў і «ЛК».

— Парт. Тройка Гар. КК КП(б)Б выклікае на 5-е лістапада г. г. у 6 гадзін веч. (Энгельса 28), наступных т. т.: ЯЧЧКО К. (3-д «Вальшавік»), КАЗЛОЎ (ф-ка «Кастрычнік»), ДЗЕДЗЮШКА І. (Саюзкуст), ІГНАТОВІЧ (Абутк. майстэрня), ОБКАЛАЎ (а-д. «Камунар»), ЛУШКЕВІЧ (Белсьпірт), ФІКС (Белільнасаюз), ВАРАБ'ЁЎ (Партк. кал-ў міліцыі), ЯУФІМАЎ (НКФ), ГРАШЧАНКАЎ (5 узв. аховы МВД), ДАРАШЭВІЧ (Хэмфармазавод), МІСЬЛІЧЫК (Валдканалтрэст), ЛЕАНОВІЧ (Хэмфармазавод), ЯКАВЕНКА (Лямцавая ф-ка), БУРАКОЎ А. Ф. (Саўгас Лекерта), ВЕРЫН (Камвуз), КАЛЕЙ (12-я разьмеркавацель), МУХАВОШЧЫК (3-д Варашылава), НІСЕНБАУМ (Дрож. завод), НОВІКАЎ (Курсы райпартактыву), ІВАШКЕВІЧ (ф-ка «Уніль»), КУЖЭЛЬ, У. ЛЕВІН (Транспартрэст), КОПІЦЬ (Гаржылсаюз), для удзелу ў разглядзе іх справ. Таксама выклікаюцца сакратары вязок, дзе гэтыя т. т. лічацца на вучоце. Яўка абавязковая.

— ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што ў г. Воршы 9-XI і ў г. Полацку 10-XI ў 10 гадз. раніцы будзе праведзена выязная парт. тройка ЦКК КП(б)Б з старшынствам т. Влоштэйна. Па ім выклікаюцца наступныя т. т. — 9-XI 31 г. у г. Воршы: Сідаровіч П. Д. Вараб'ёў Я., Міліцкі Я. Я., Гарадзеў Л. Р., Вокша Л. М.—Талачынскі р-н; Фрэнкель—Кохапава, Харытаненка І. Е., Бабочкін І. Д.—Аршанскі р-н; Трусаў Л. М., Сяцкевіч Я. А., Чавусаў І. С., Браўдэ М. А.—Дубровна, Лянчук М. З., Татаринаў І. А., Шпябека І. М., Марусенка І., Жарабцоў А. І., Вамільеў П. С., Міхайлаўскі П. Я., Мішкін С. С., Прыкута М., Брагуноў М. А.—Ворша. На 10-XI у г. Полацку: Бараноўскі В., Жаўчкоў Г. А., Ушакоў Г. А., Рожкін С. В., Веселаўскі А. К.—Дрысенскі р-н; Мядзелскі І. У., Сорыя Д. М., Гурскі В. П., Зялянкоў В. Р., Пажарскі Л. П., Пекарскі Хв. І., Плаўнік Р. Э., Стрыжакна У. П., Волкінд Л. І., Сяцюк К. В., Драгуноў А. М.—Полацкі р-н; Прапода С. І., Гуськоў Я. С.—Вушачы; Варысейка М.—Асьвейскі р-н; Лоўкін П. Я.—Расонскі р-н; Валай Ю, Ларыменаў Г. Пажадана прысутнасьць сакратароў парт. ячэек, на вучоце якіх знаходзяцца пакаранныя т. т.

5 лістапада, у 7 гадзін вечара
адбудзецца
пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у БССР.
Парадак дня: фінплян арганізацыі МОПР'ў БССР на 1932 г.
Яўка ўсіх членаў прэзыдыуму і членаў ЦК абавязкова.
Запрашаецца МОПР-актыў.
ЦК МОПР'у БССР.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
пад кіраўніцтвам народнага артыста Голубка
абвяшчае
НАБОР АРТЫСТАЎ І СУПРАЦОЎНІКАЎ (мужчын і жанчын) а таксама адміністратара тэатру.
Іспыт будзе 10 лістапада ў 1 гадз. дня, у Доме Калгасьнікаў.

„КУЛЬТУРА" Пач.: 7, 8-45, 10-30 — Падарожжа Свэн-Гедына па пустынях Цэнтральнай Азіі
„Інтэрнацыянал" — Звыш праграм. — УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ АКАДЭМІІ НАВУК. Мастацкі фільм Барыслаў сьмяецца
Адкр. з 12 г. дня
ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня — Мастацкі фільм На хачу дзіцяці. Звыш праграмы Наступленьне ўзвода
„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — Мастацкі фільм МЯЦЕЖ. Звыш праграмы—ХРОНІКА
„СПАРТАК" Каса адкрыта 35 г. — Выдатны фільм ГАМБУРГ ў 8 частках

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Ад серады, 4 лістапада
Зноў на нашым экране лепшы гукавы фільм Саюзкіно
ГЛЯДЗЕЦЕ!
АДНА
Рэжысэры: Козінцаў і Траўберг.
Кампазітар—Шастаковіч.
У галоўных ролях:
Е. Кузьміна, М. Бабанова, С. Герасімаў, Н. Сабалеўскі, Ван-Люі-Сян
Пачатак у 7, 8-45 і 10-30. Каса—ад 5 г.

АКТАВАЯ ЗАЛЯ БДУ
Сёньня, 4-га лістапада ў 7 гадзін вечара адбудзецца
агульна-гарадзкі сход навуковых працаўнікоў.
— ПАРАДАК ДНЯ: —
1. Вынікі III-га Ўсебеларускага зьезду навуковых працаўнікоў.
2. Выбары гарадзкога бюро секцыі навуковых працаўнікоў.
3. Бягучыя справы.
Там-жа за гадзіну да пачатку сходу адбудзецца пасяджэньне камфракцыі сходу.
Яўка абавязкова.
Цэнтральнае бюро СНП.

БЕЛАРУСКАЕ КІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ
— з 10 лістапада адкрывае —
3-месячныя КУРСЫ бухгальтароў-рахункаводаў сувязі.
На курсы прымаюцца працаўнікі знаёмыя з рахункаводствам і незнаёмыя, якія маюць адукацыю ў аб'ёме 9-годкі.
Усім курсантам будзе выплачвацца стыпендыя ў разьмерах ад 60 да 75 руб., а за працаўнікамі сувязі, што працуюць у райвёдзелах, якія будуць камандыраваны на КУРСЫ, захоўваецца і іх пэнсія.
Прыехаўшыя з раённай забясьпечваюцца інтэрнатам; курсанты, якія змогуць пражыць на прыватнай кватэры, атрымаюць кампэнсацыю за кватэру.
Па скончэньні бухгальтары-рахункаводы будуць накіраваны па райвёдзелах.
Заявы пр